КОНТРОЛЬНЫЙ
ЭКЗЕМПЛЯР

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ПЕДАГАГІЧНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ
ІМЯ МАКСІМА ТАНКА»

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар па вучэбнай рабоце
__________ А.В.Макоўчык
«22» ____12____ 2021 г.
Рэгістрацыйны № УД 21-1-12-2021 /вуч.

# БЕЛАРУСКАЯ ДЗІЦЯЧАЯ ЛІТАРАТУРА

**Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасцей**
**1-02 03 01 Беларуская мова і літаратура;**
**1-02 03 03 Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (з указаннем мовы)**

2021 г.

Вучэбная праграма распрацавана на аснове адукацыйных стандартаў вышэйшай адукацыі АСВА 1-02 03 01-2021 і АСВА 1-02 03 03-2021 і вучэбных планаў 1-02 03 01 «Беларуская мова і літаратура», 1-02 03 03 «Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (з указаннем мовы)»

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**

І.М.Мішчанчук, загадчык кафедры беларускай і замежнай літаратуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», кандыдат філалагічных навук, дацэнт;

С.А.Сычова, старшы выкладчык кафедры беларускай і замежнай літаратуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

С.Л.Гаранін, вядучы навуковы супрацоўнік ДНУ «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», кандыдат філалагічных навук, дацэнт;

І.П.Кудраватых, прафесар кафедры мовазнаўства і лінгвадыдактыкі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», доктар філалагічных навук, прафесар

**УЗГОДНЕНА:**

Дырэктар
ДУА «Сярэдняя школа № 191 г. Мінска» ______________ Ю.І.Пінчук

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай беларускай і замежнай літаратуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»
(пратакол № 5 ад 26.11.2021 г.)

Загадчык кафедры
______________ І.М.Мішчанчук

Навукова-метадычным саветам установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»
(пратакол № 3 ад 22.12 2021 г.)

Афармленне вучэбнай праграмы і суправаджаючых яе матэрыялаў дзеючым патрабаванням Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь адпавядае

Метадыст ВМА ______________ Я.В.Ціханава

Дырэктар бібліятэкі ______________ Н.П.Сяткоўская

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне «Беларуская дзіцячая літаратура» прызначана для студэнтаў УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», якія навучаюцца па спецыяльнасцях 1–02 03 01 «Беларуская мова і літаратура», 1–02 03 03 «Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (з указаннем мовы)».

Вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне «Беларуская дзіцячая літаратура» складзена ў адпаведнасці з канцэпцыяй літаратурнай адукацыі, адукацыйнымі стандартамі і вучэбнымі планамі для спецыяльнасцей 1–02 03 01 «Беларуская мова і літаратура», 1–02 03 03 «Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (з указаннем мовы)».

Дзіцячая літаратура аб'ядноўвае вялікі па аб'ёме. На сучасным этапе літаратура для дзяцей і юнацтва плённа развіваецца, выпрацоўваюцца новыя крытэрыі ацэнкі твораў, што і знайшло адлюстраванне ў змесце прапанаванай праграмы.

**Мэты** вучэбнай дысцыпліны: пазнаёміць студэнтаў са шляхамі развіцця беларускай дзіцячай літаратуры ад вытокаў да сённяшняга часу, прааналізаваць асаблівасці творчасці пісьменнікаў для дзяцей, змест іх твораў, паказаць іх ролю ў літаратурным працэсе.

**Задачы** вучэбнай дысцыпліны:

– даць студэнтам рознабаковыя веды па прадмеце;
– прасачыць гісторыю ўзнікнення і існавання жанравых форм;
– выпрацаваць навыкі аналізу мастацкага твора, уменне ацэньваць ідэйна-эстэтычныя вартасці мастацкіх з'яў, вызначаць пазнавальны і выхаваўчы патэнцыял твора;
– садзейнічаць выхаванню добрага эстэтычнага густу, развіццю самастойнага творчага мыслення;
– фарміраваць і развіваць сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі студэнтаў, заснаваныя на ведах па прадмеце, эмацыянальна-каштоўнасным і творчым вопыце, што забяспечвае вырашэнне і выкананне грамадзянскіх, прафесіянальных задач і функцый.

Вучэбная праграма дысцыпліны «Беларуская дзіцячая літаратура» прадугледжвае дэталёвы разгляд твораў для дзяцей і шырокае выкарыстанне магчымасцей літаратуры ў працэсе прафесіянальнай падрыхтоўкі студэнтаў. Яна складаецца з аглядавых і манаграфічных тэм, у аглядавых тэмах больш увагі надаецца пісьменнікам, творчасць якіх не вывучаецца манаграфічна.

Практычныя заняткі павінны насіць актыўны, творчы характар, развіваць самастойнасць мыслення студэнтаў. Заняткі можна праводзіць у форме гутаркі, абмеркавання падрыхтаваных студэнтамі паведамленняў, рэцэнзій, напісаных імі на зборнікі твораў для дзяцей.

Некаторыя тэмы рэкамендуюцца для самастойнага вывучэння, прычым выкладчык арыентуе студэнтаў на навуковы пошук адпаведнай літаратуры, дакладна акрэслівае мэты і задачы даследчай працы.

*Месца вучэбнай дысцыпліны ў сістэме падрыхтоўкі спецыяліста, сувязі з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі.* Дысцыпліна «Беларуская дзіцячая літаратура» для спецыяльнасцей 1–02 03 01 «Беларуская мова і літаратура», 1–02 03 03 «Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (з указаннем мовы)» уваходзіць у кампанент дысцыплін установы вышэйшай адукацыі. Дысцыпліна «Беларуская дзіцячая літаратура» грунтуецца на прынцыпах каардынацыі па лініі міжпрадметных сувязей з вучэбнымі вучэбнымі дысцыплінамі «Вусная народная творчасць», «Уводзіны ў літаратуразнаўства», якія ўваходзяць у кампанент установы вышэйшай адукацыі для спецыяльнасцей 1–02 03 01 «Беларуская мова і літаратура», 1–02 03 03 «Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (з указаннем мовы)».

*Патрабаванні да засваення вучэбнай дысцыпліны.* Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Беларуская дзіцячая літаратура» павінна забяспечыць фарміраванне ў студэнтаў кампетэнцыі СК-5: характарызаваць асноўныя тэндэнцыі развіцця дзіцячай літаратуры, абапіраючыся на знакавыя літаратурныя творы для дзяцей.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен *ведаць*:

- шляхі і галоўныя этапы развіцця нацыянальнай літаратуры для дзяцей ад вытокаў і да нашых дзён;
- асноўныя этапы жыццёвага і творчага шляху дзіцячых пісьменнікаў;
- узаемасувязь светапогляду і творчасці пісьменніка, асаблівасці яго стылю ці творчай манеры;
- канкрэтна-гістарычнае, нацыянальнае і агульначалавечае значэнне мастацкіх твораў;
- галоўныя ідэйна-эстэтычныя праблемы вывучаемых твораў, асаблівасці іх кампазіцыі і вобразна-выяўленчых сродкаў;
- герояў твораў, адметныя рысы характару, месца ў сістэме вобразаў;
- заканамернасці існавання і развіцця літаратурных жанраў;
- літаратуразнаўчыя крыніцы па тэмах дысцыпліны.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен *умець*:

- аналізаваць літаратурны твор, раскрываючы асаблівасці яго зместу і формы;
- выяўляць падобнае і адрознае ў літаратурах для дзяцей розных часоў і народаў;
- вызначыць месца твора ў мастацкай сістэме пісьменніка і ў літаратуры свайго часу;
- ацэньваць ідэйна-эстэтычныя вартасці мастацкіх з’яў;
- скласці тэсты, віктарыны, красворды па літаратурных творах, фактах жыццёвага і творчага шляху аўтара;
- працаваць з навукова-крытычнай і даведачнай літаратурай па дысцыпліне для паглыблення ўласных ведаў, больш шырокага разумення эстэтычнай і грамадскай каштоўнасці твораў ці ў цэлым творчасці пісьменніка, а таксама для развіцця ўмення самастойнай навукова-даследчай працы.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен *валодаць*:

- метадалогіяй літаратуразнаўчага аналізу;
- навыкамі свабоднага карыстання адпаведным літаратуразнаўчым апаратам пры рашэнні канкрэтных задач;
- навыкамі выразнага чытання твораў.

Прапанаваная канцэпцыя дысцыпліны прадугледжвае фарміраванне ў студэнтаў усёй сукупнасці ведаў, уменняў і навыкаў па дзіцячай літаратуры ў адпаведнасці з адукацыйнымі стандартамі, а таксама ў пэўнай ступені фарміраванне светапогляду студэнтаў, развіццё творчага мыслення і эстэтычнага густу.

У рамках адукацыйнага працэсу па вучэбнай дысцыпліне «Беларуская дзіцячая літаратура» студэнт павінен набыць не толькі тэарэтычныя і практычныя веды, уменні і навыкі па спецыяльнасці, але і развіць свой каштоўнасна-асобасны, духоўны патэнцыял, сфарміраваць якасці патрыёта і грамадзяніна, гатовага да актыўнага ўдзелу ў эканамічным, вытворчым, сацыяльна-культурным і грамадскім жыцці краіны.

Па кожнай вучэбнай тэме ў адпаведнасці з яе мэтамі і задачамі па фарміраванні і развіцці ў студэнтаў канкрэтных кампетэнцый выкладчык (кафедра) праектуе і рэалізуе канкрэтныя педагагічныя тэхналогіі.

*Асноўнымі адукацыйнымі тэхналогіямі з'яўляюцца*: праблемнае навучанне (праблемнае выкладанне, пошукавы метад); камунікатыўныя тэхналогіі, заснаваныя на актыўных формах і метадах навучання (дыскусія, круглы стол, прэзентацыя, работа ў групах); асобасна арыентаваная тэхналогія.

*Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў*. Пры вывучэнні вучэбнай дысцыпліны «Беларуская дзіцячая літаратура» выкарыстоўваюцца такія формы самастойнай работы, як выкананне індывідуальных заданняў на практычных занятках, выкананне індывідуальных заданняў пазааўдыторна (самастойная работа студэнтаў), напісанне рэфератаў, падрыхтоўка дакладаў, афармленне часопісаў, складанне анталогій і інш.

*Агульная колькасць гадзін, колькасць аўдыторных гадзін, форма атрымання вышэйшай адукацыі, размеркаванне аўдыторных гадзін, формы бягучай атэстацыі.* Вывучэнне дысцыпліны "Дзіцячая літаратура" разлічана на 100 гадзін, з іх 56 аўдыторных: 28 лекцыйных і 28 гадзін практычных заняткаў, на самастойную работу адводзіцца 44 гадзіны. Форма атрымання вышэйшай адукацыі – дзённая (I курс, 2 семестр), форма бягучай атэстацыі – залік.

| Семестр | Усяго | Лекцыі | Практычныя | Самастойная работа студэнтаў | Форма кантролю |
|---|---|---|---|---|---|
| II | 100 | 28 | 28 | 44 | Залік |

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## Тэма 1. Уводзіны. Вытокі дзіцячай літаратуры

Паняцце аб дзіцячай літаратуры і дзіцячым чытанні. Спецыфіка літаратуры для юнага чытача. Роля мастацкага афармлення кніг для дзяцей адпаведнага ўзросту.

Пытанні тэорыі дзіцячай літаратуры. Пераасэнсаванне некаторых тэарэтычных праблем ва ўмовах сучаснага жыцця.

Перыядызацыя дзіцячай літаратуры.

Беларускія пісьменнікі XIX – пачатку XX ст. пра выхаванне падрастаючага пакалення. Ф. Багушэвіч пра неабходнасць стварэння кніжак для дзяцей на роднай мове. Артыкулы Цёткі, Якуба Коласа пра выхаванне ў юнага пакалення любові да роднага слова.

Тэарэтычныя артыкулы і выказванні пра дзіцячую літаратуру пісьменнікаў – Якуба Коласа («Шануйце і любіце сваю родную мову», урыўкі з «Методыкі роднай мовы»), Янкі Маўра («Дзіцячы пісьменнік і дзіцячы чытач», «Хоць малыя, але чалавекі!»), Алеся Якімовіча («Праблемы сучаснай дзіцячай літаратуры», «Размова пра дзіцячую літаратуру», «Галоўная праблема – якасць»), Васіля Віткі («Выхаванне словам», «Часцей глядзіце на зоры»).

Карней Чукоўскі пра спецыфіку мастацкай літаратуры для юнага чытача («Запаведзі для дзіцячых паэтаў»).

Эстэтычная, пазнавальная, выхаваўчая функцыі дзіцячай літаратуры, яе роля ў агульным працэсе навучання.

Агляд вучэбнай і крытычнай літаратуры па дысцыпліне.

Вусная народная творчасць як першааснова дзіцячай літаратуры.

Узнікненне беларускага кнігадрукавання, распаўсюджванне кніг вучэбнага прызначэння (Францыска Скарыны «Псалтыр» (1517) – «Детям малым початок всякое доброе науки…», Сымона Буднага «Катэхізіс» (1562) – кніга для дарослых і падручнік для дзетак; Лаурэнція Зізанія «Наука ку читаню и розуменю писма словенского» (1596).

Асветніцкая дзейнасць Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча (1808–1884).

Паўлюк Багрым (1813 – каля 1890). Гістарычныя факты і легенды пра лёс паэта. Тэма абяздоленага дзяцінства ў вершы «Зайграй, зайграй, хлопча малы...». Фальклорныя матывы ў вершы, нацыянальны каларыт, паэтычнае хараство.

Францішак Багушэвіч (1840–1900). Старонкі жыцця паэта паводле кніг У.Содаля «Свіранскія крэскі» (1995), В. Хомчанкі «Пры апазнанні – затрымаць» (1983). Паэт і дзеці (артыкулы У. Содаля і М. Маляўкі).

Сувязь з фальклорам – адна з характэрных асаблівасцей творчасці Ф. Багушэвіча. Выкарыстанне народных вобразаў і матываў, напаўненне іх сацыяльным зместам у вершы «Калыханка». Твор у прачытанні Максіма Гарэцкага.

Янка Лучына (1851–1897). Думка пра «сонца навукі» для дзяцей, выказаная ў вершы «Роднай старонцы».

Адам Гурыновіч (1869–1894). Пейзажныя вершы ў спадчыне паэта («Бор», «Вясна») і дыдактычныя («Каток», «Рыбак»).

Значэнне твораў П. Багрыма, Ф. Багушэвіча, Я. Лучыны, А. Гурыновіча ў развіцці дзіцячай літаратуры.

**Тэма 2. Дзіцячая літаратура пачатку ХХ стагоддзя**

Беларускае нацыянальнае адраджэнне. Адкрыццё нацыянальных школ, легалізацыя беларускага друку (выхад газет «Наша доля», Наша ніва»). Дзейнасць выдавецкай суполкі «Загляне сонца і ў наша аконца» (Пецярбург, 1906–1914). Прыход у літаратуру Цёткі, Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча.

«Беларускі лемантар» (1906) – першая кніга для навучання дзяцей роднай мове. Пытанне аб аўтарстве.

Цётка (1876–1916). Асветніцкая дзейнасць пісьменніцы, яе роля ў станаўленні літаратуры для дзяцей.

«Першае чытанне для дзетак беларусаў» (1906). Тэма жыцця беларускай вёскі як асноўная тэма твораў чытанкі («Нядзеля», «Наша гаспадарка», «Мая вёска»). Паэтызацыя прыроды ў вершах «Лес», «Мой сад». Фальклорныя творы ў кнізе (казкі, прыказкі, загадкі, прыпеўкі).

Маральна-этычная праблематыка апавяданняў з кнігі «Гасцінец для малых дзяцей» (1906).

Дзіцячы свет у паэзіі Цёткі (вершы «Сынок маленькі», «Сірацінка»). Гуманістычны змест апавядання «Міхаська». Выкарыстанне Цёткай фальклорнага матыву аб нешчаслівай сірочай долі.

Удзел Цёткі ў выданні першага беларускага часопіса для моладзі «Лучынка» (1914). Цётка як пачынальніца навуковай белетрыстыкі для дзяцей (артыкулы на старонках часопіса «Гутаркі аб птушках»: «Жаваранак», «Пералётныя птушкі» і інш.).

«Другое чытанне для дзяцей беларусаў» (1909) Якуба Коласа. Кампазіцыя кнігі. Ідэйна-тэматычнае і жанравае багацце твораў чытанкі, іх гуманістычны змест: паэтызацыя прыроды («Вясна», «Лета», «Зіма», «Восень»), апісанне вясковага побыту («Вясковая дарога», «Палеская вёска»). Вобразы дзяцей («Школа», «Прылёт птушак», «Ластаўкі»). Філасофскі сэнс алегарычнага апавядання «Дуб і чароціна». Праблематыка казак («Мужык і пан», «Воўк-дурань», «Леў і воўк», «Цяжкая доля», «Зайчыкі», «Песня птушкі»). Уплыў кніг «Роднае слова», «Дзіцячы свет» К. Ушынскага.

Адукацыйнае і выхаваўчае значэнне чытанак Цёткі, Якуба Коласа, іх роля ў пашырэнні асветы на Беларусі ў пачатку ХХ стагоддзя, у станаўленні і развіцці беларускай нацыянальнай культуры, дзіцячай літаратуры.

Кандрат Лейка (1860–1921). Арніталагічны цыкл вершаў «Сарока», «Бусел», «Журавель», «Птушкі» і інш. Фальклорная першаснова твораў.

К. Лейка – пачынальнік нацыянальнай драматургіі для дзяцей. Казачны сюжэт п'есы «Снатворны мак» (1912). Адухоўленыя вобразы кветак (Мак, Званочак, Ружа, Разяда). Асуджэнне сквапнасці, хітрасці і здрадніцтва (Матыль, Скакунец, Аса). Павучальны змест твора. Выяўленне гуманістычных ідэалаў

аўтара.

Францішак Аляхновіч (1883–1944). П’еса-казка «У лясным гушчары» (1917). Дабро перамагае зло як асноўны матыў твора.

Карусь Каганец (1868 – 1918). Песенна-лірычныя творы для дзяцей («Салавейка», «Жаваронча малы», «Сонейка прыгрэла», «Песня зіме»). Ідэйны змест апрацаваных пісьменнікам народных казак «Журавель і чапля», «Ваўчок», паданняў «Адкуль зязюля ўзялася», «Скрыпач і ваўкі».

Вацлаў Ластоўскі (1883–1938). Увага пісьменніка да пытанняў школьнага навучання. Агляд кніг «Родныя зярняты» (1915), «Незабудка» – першая пасля лемантара чытанка (1918), «Сейбіт» – другая пасля лемантара чытанка (1918). Фальклорныя матывы ў творах В. Ластоўскага («Варона і рак», «Пра зязюлю», «Бяздоннае багацце», «Зайчык», «Краскі»).

Максім Багдановіч (1891–1917). Паэтызацыя прыроды ў вершах («Па-над белым пухам вішняў...», «Зімой», «Завіруха», «Зімовая дарога» і інш.). Глыбокі псіхалагізм у апавяданнях М. Багдановіча. Зварот М. Багдановіча да фальклорных матываў. Ідэйны змест казкі «Мушка-зелянушка і камарык – насаты тварык» (1915). Далучэнне дзяцей да асноў народнай маралі. Майстэрства М. Багдановіча як паэта-казачніка. Агляд кнігі А. Марціновіча «Свяці, зорка, свяці: дзецям пра Максіма Багдановіча» (2011).

## Тэма 3. Дзіцячая літаратура ў 20-я гады ХХ стагоддзя

Задачы літаратуры для юнага чытача: асваенне новых тэм, пашырэнне сувязі з жыццём, жанравае ўзбагачэнне.

Перыядычны друк для дзяцей. Дзейнасць часопісаў «Зоркі» (1921–1922), «Беларускі піянер» (1924–1929), газеты «Піянер Беларусі» (з 1929).

Дыскусія аб развіцці казачнага жанру ў літаратуры для падрастаючага пакалення. Іранічны змест казкі У. Жылкі «Курка Рабка». Выхад у свет казак Якуба Коласа, Змітрака Бядулі, У. Дубоўкі, С. Шушкевіча.

Жыццесцвярджальны, мажорны, рамантычна-ўзнёслы пафас паэзіі (вершы Янкі Купалы, Якуба Коласа, А. Александровіча, А. Якімовіча і інш.).

Ідэйна-тэматычныя набыткі прозы для юнага чытача. Праблематыка зборнікаў апавяданняў «Першыя крокі», «Крок за крокам» (1925) Якуба Коласа, «Гул бубна» (1925) А. Якімовіча. Вобразы дзяцей у апавяданнях М. Зарэцкага, М. Гарэцкага. Апавяданні Янкі Маўра 1920-х гадоў, іх роля ў пашырэнні тэматычных абсягаў дзіцячай літаратуры.

Першыя юнацкія аповесці «Свінапас» (1923–1924) Міхася Чарота, «Два» (1925) А. Вольнага. Спроба стварэння прыгодніцкага рамана – «Ваўчаняты» (1925) А. Александровіча, А. Вольнага, А. Дудара. Адлюстраванне ў творах змагання юных герояў за свабоду свайго народа, за вызваленне роднага краю ад акупантаў.

Драматычныя творы для дзяцей. П’есы М. Чарота «Пастушкі» (1921), С. Новіка-Пеюна «Цудоўная ноч» (1927), «Ёлка Дзеда Мароза» (1927).

Алесь Гарун (1887–1920). Шматграннасць таленту. Паэтызацыя прыроды, выяўленне пашаны да роднай мовы ў вершаваным зборніку «Матчын дар» (1918).

Услаўленне справядлівасці, міласэрнасці, дабрыні ў п’есах «Хлопчык у лесе» і інш. (зб. «Жывыя казкі для дзіцячага тэатру», 1920).

Перыядычны друк у Заходняй Беларусі. Дзейнасць часопіса «Заранка» (1927 – 1931, рэдактар Зоська Верас). Папулярызацыя роднага слова на старонках часопіса (творы А. Гаруна, К. Буйло, Я. Коласа, М. Машары і інш.). Поспехі і выдаткі ў літаратуры 1920-х гадоў.

## Тэма 4. Дзіцячая літаратура ў 30-я гады ХХ стагоддзя

Далейшае развіццё дзіцячай літаратуры ў жанравых і тэматычных адносінах. Роля перыядычных выданняў у папулярызацыі мастацкага слова. Беларуская літаратура на старонках заходнебеларускіх часопісаў «Пралеска» (1934 – 1935), «Снапок» (1937), «Беларускі летапіс» (1933 – 1939).

Пошукі пісьменнікаў у стварэнні вобраза юнага героя сучаснасці (аповесці «Перамога», 1930, «Незвычайны мядзведзь», 1935, Алеся Якімовіча, «Пастка», 1935, Сымона Баранавых). Пэўная зададзенасць сюжэтаў, схематызм і спрошчанасць характараў. Свет прыроды і дзяцінства ў апавяданнях Л. Чарняўскай (кнігі «Варка», 1928, «Кот Знайдзён», 1929, «Андрэйка», 1930, «Лявонка», 1932, «Сталёвы конь», 1933).

Узбагачэнне мастацкага вопыту дзіцячай літаратуры творамі Янкі Маўра («Палескія рабінзоны», 1930), М. Лынькова («Міколка- паравоз», 1936). Паглыбленне псіхалагізму ў творах гэтага перыяду («Насцечка», 1940, Кузьмы Чорнага).

Паэзія для дзяцей: народна-песенныя матывы, патрыятычны пафас (вершы «Дзіцячае» Янкі Купалы, «За навуку», «Дзед-госць» Якуба Коласа, «Маладая вясна» Змітрака Бядулі).

Жанр казкі ў дзіцячай літаратуры 30-х гг. («Каваль Вярнідуб», 1935, А. Якімовіча; «Пра смелага ваяку Мішку і яго слаўных таварышаў», 1935, М. Лынькова; «Мурашка Палашка», 1939, «Сярэбраная табакерка», 1940, Змітрака Бядулі).

Дзіцячая драматургія: п'есы «Цудоўная дудка», «Дзед і жораў» (1939) В. Вольскага. Фальклорная аснова твораў. Сцэнічнае жыццё.

## Тэма 5. Янка Купала

Янка Купала (1882–1942). Маленства паэта паводле кнігі З. Бандарынай «Ой, рана на Івана...» (1979), У. Сулкоўскага, А. Міраславіча «Янка Купала» (2007), У. Ліпскага «Янкаў вянок: дзецям пра Янку Купалу» (2009).

Цеплыня, непасрэднасць, эмацыянальная танальнасць, лірызм, сувязь з традыцыямі беларускага дзіцячага фальклору як адметныя рысы творчасці Янкі Купалы для юнага чытача. Паэтычны роздум над лёсам дзяцей, іх будучыняй (вершы «Над калыскай»,»Сірочая доля», «Песня сіраты»).

Вершы Янкі Купалы на старонках часопіса «Зоркі»: «Песня і казка», «Мароз», «Бай», «Сын і маці» і інш. Думка аб неабходнасці спалучэння ў дзіцячай літаратуры казачнага з рэалістычным («Песня і казка»). Абуджэнне ў дзяцей пачуцця нацыянальнай годнасці, выхаванне любові да роднай зямлі, да роднай мовы – верш «Сын і маці». Сугучнасць думак верша нашаму часу. Паэтызацыя красы зімовай прыроды ў вершы «Мароз». Традыцыі фальклорнай

паэтыкі ў творчасці Янкі Купалы.

Вершы Янкі Купалы 30-х гг. для юных чытачоў. Выкарыстанне фальклорных матываў і танцавальнай рытмікі ў вершы «Дзіцячае». Заахвочванне дзяцей да вучобы. Гісторыя напісання верша «Хлопчык і лётчык». Паэтызацыя духоўнага свету юнага героя: цікаўнасць, прага ведаў, імкненне пранікнуць у таямніцы сусвету. Пераклад верша на рускую мову М. Ісакоўскім. Паказ шырокіх жыццёвых перспектыў для моладзі ў вершах «Сыны», «Алеся». «Хлопчык і лётчык на вайне» – раскрыццё думак і перажыванняў падлетка, абумоўленых трагедыяй вайны. Элементы ўмоўнасці ў творы.

Янка Купала – перакладчык дзіцячай паэзіі (пераклады вершаў «Ёлачка» Р. Кудашовай, «Дзед і баба» Ю. Крашэўскага).

Эстэтычнае і выхаваўчае значэнне твораў Янкі Купалы для юных чытачоў.

**Тэма 6. Якуб Колас**

Якуб Колас (1882–1956). Маленства пісьменніка паводле кніг Максіма Лужаніна «Песня з леснічоўкі» (1982), С. Александровіча «На шырокі прастор» (1972), У.Сулкоўскага, А. Міраславіча «Якуб Колас» (2007), М. Маляўкі «Коласаў абярэг: дзецям пра Якуба Коласа» (2011).

Увага пісьменніка да праблем нацыянальнай літаратуры. Якуб Колас – аўтар «Другога чытання для дзяцей беларусаў».

Гуманістычны змест апавяданняў «Дзеравеншчына» (1912), «Сірата Юрка» (1914), «У старых дубах» (1912). Прырода і дзеці. Паказ імкнення дзяцей да свету, дзе пануе гармонія. Тыпалагічнае падабенства апавяданняў «Ванька» А.Чэхава і «Дзеравеншчына» Якуба Коласа. Праблематыка апавяданняў «Страшнае спатканне», «Наталька», Джон і муха», «Рыбакі», «Чоран». Глыбіня пранікнення ў псіхалогію дзяцей.

Народная казка ў апрацоўцы Якуба Коласа («Дудар», «Як пеўнік ратаваў курачку», «Пчала і шэршань», «Зайкіна хатка» і інш.).

Фальклорная аснова і павучальны змест казкі «Дзед і мядзведзь» (1918).

Вершаваная казка «Рак-вусач» (1926). Творчае пераасэнсаванне матываў казак «Дуб і чароціна», «Цяжкая доля», «Лёгкі хлеб». Вобразы рака-пустэльніка, карася-паэта, жыта. Паэтызацыя прыроды. Эстэтычнае, пазнавальнае і выхаваўчае значэнне казкі.

Пейзажныя вершы для дзяцей: «На полі вясной», «На рэчцы зімою», «Песня аб вясне», «Зіма», «На лузе», «Ручэй» і інш. Меладычнасць, высокая культура верша. Сатырычны верш «Савось-распуснік» (1926). Майстэрства паэта-псіхолага.

Паэма «Міхасёвы прыгоды» (1934). Прырода і дзеці. Арганічнае адзінства лірычнага і эпічнага пачаткаў. Метафарычнасць мовы.

«На прасторах жыцця» (1926) як першая спроба распрацаваць жанр юнацкай аповесці. Паэтызацыя калектыўнай працы. Імкненне моладзі да набыцця ведаў, да асветы. Сучаснае прачытанне твора.

Якуб Колас – тэарэтык дзіцячай літаратуры. Традыцыі Коласава

майстэрства ў сучаснай літаратуры для юнага чытача.

## Тэма 7. Змітрок Бядуля

Змітрок Бядуля (1886–1941). Маленства Змітрака Бядулі (Самуіла Яфімавіча Плаўніка) паводле кнігі «У дрымучых лясах» (1940).

Пачатак літаратурнай дзейнасці. Тэматыка, мастацкія асаблівасці апавяданняў 1912 – 1915 гг. («Пяць лыжак заціркі», «Малыя дрывасекі», «Велікодныя яйкі», «Дзе канец свету?»). Драматызм, вастрыня канфліктаў, глыбокі псіхалагізм, прастата і лаканічнасць апісання.

Змітрок Бядуля – галоўны рэдактар часопіса «Зоркі». Погляды пісьменніка на развіццё дзіцячай літаратуры і перыядычнага друку (артыкулы «Справа стварэння новых школьных падручнікаў і выдання дзіцячага часопіса», «У справе выдання беларускіх кніг», «Аб дзіцячым друку» і інш.).

Паэзія З. Бядулі для маленькага чытача: «Мае забавы», «Дудачка», «Калыханка», «Вясной», «Сняжынкі», «Конік», «Лісічка», «Верабейчык» і інш. Гармонія чалавека і прыроды. Песенная, музычная інструментоўка вершаў. Дынамічнасць сюжэтаў, графічная выразнасць малюнкаў, вобразнасць мовы.

Зварот да сюжэтаў і матываў вуснай народнай творчасці. Аналіз казак «Скарб», «Бліночак з неба», «Іванка-прастачок», «Музыка». Ідэя неперарможнасці калектыву ў вершаванай казцы «Мурашка Палашка» (1939). Алегарычны сэнс вобразаў і сітуацый. Мастацкія асаблівасці. Пошукі новых шляхоў мастацкага адлюстравання агульначалавечых праблем. Увасабленне ідэі бяссмерця ў казачным жанры – аповесць «Сярэбраная табакерка» (1940). Кантрастнае размежаванне дабра (вобразы дзіда-дзеда, лесніка, шаўца Юркі Дратвы, паляўнічага Саўкі, сіраты Люсенькі, аптэкара Савіцкага, каваля Ксаверы) і зла (вобразы пані Сарачынскай, кардынала Баніфацыя, караля Пінг-Понга і інш.). Умоўнасць вобразаў. Праблема захавання міру на зямлі. Асаблівасці кампазіцыі – спалучэнне рэальных сцэн з фантастычнымі. Афарыстычнасць мовы. Васіль Вітка пра «Сярэбраную табакерку».

Майстэрства Змітрака Бядулі як дзіцячага пісьменніка.

## Тэма 8. Янка Маўр

Янка Маўр (1883–1971). Старонкі жыцця Янкі Маўра (Івана Міхайлавіча Фёдарава) паводле аўтабіяграфічнай аповесці «Шлях з цемры» (1948–1957). Праца настаўнікам. Шматграннасць таленту пісьменніка.

Пачатак літаратурнай дзейнасці. Навукова-пазнавальная аповесць «Чалавек ідзе» (1926). Апісанне клімату, жывёльнага, раслiннага свету, жыцця першабытных людзей. Элементы казачнасці ў творы.

Апавяданні 20-х гадоў «Слёзы Тубі», «Незвычайная прынада», «Лацароні». Вобразы дзяцей у іх. Асаблівасці кампазіцыі. Роля эпілогаў у раскрыцці ідэйнага зместу твораў.

Распрацоўка жанраў прыгодніцкай аповесці («У краіне райскай птушкі», 1928, «Сын вады», 1928), рамана для юнага чытача («Амок», 1929). Праблема правоў чалавека і чалавечнасці. Апісанне экзатычнай прыроды, нораваў і звычак тубыльцаў праз напружаныя сітуацыі і займальнасць сюжэту.

Зварот да нацыянальнай тэматыкі. Праблема чалавека і прыроды, іх

узаемаадносін у аповесці «Палескія рабінзоны» (1930). Творчая распрацоўка пісьменнікам традыцыйнага сюжэта рабінзанады. Праблема выхавання асобы ў паўсядзённым жыцці (школьная аповесць «ТВТ», 1934). Асоба і калектыў. Ацэнка аповесці «ТВТ» Янкам Купалам, М. Горкім, С. Маршаком.

Псіхалагічныя апавяданні Янкі Маўра 30-х гадоў: «Шчасце», «Бярозавы конь», «Падарожжа вакол дома». Вобразы дзяцей. Матывы дабрыні, даверу, узаемаразумення паміж людзьмі.

Гуманістычны пафас, глыбокі псіхалагізм твораў пра абпаленае вайной маленства («Дом пры дарозе», «Завошта?», «Максімка», незакончаная аповесць «Дзяўчына-маці»).

Спроба распрацаваць жанр фантастычнай аповесці («Фантамабіль прафесара Цылякоўскага, 1954). Навуковая дакладнасць і мастацкія пралікі.

Аўтабіяграфічная аповесць «Шлях з цемры» (першая частка надрукавана ў 1948 г., другая – у 1956, трэцяя – у 1957). Вобразы Янкі і маці. Адметнасць кампазіцыі.

Значэнне творчасці Янкі Маўра ў развіцці дзіцячай літаратуры. Творы пісьменніка ў ацэнцы крытыкаў і літаратуразнаўцаў.

**Тэма 9. Дзіцячая літаратура першага пасляваеннага дзесяцігоддзя**

Грамадска-палітычная атмасфера пасля Перамогі. Абмеркаванне праблем развіцця дзіцячай літаратуры на пісьменніцкіх з'ездах і пленумах (выступленні А. Якімовіча, Э. Агняцвет, А. Пальчэўскага і інш.).

Прыход новых аўтараў (Васіль Вітка, А. Вольскі, П. Кавалёў, А. Васілевіч, Я. Бяганская, В. Хомчанка, Н. Гілевіч, Е. Лось, А. Дзеружынскі і інш.)

Патрыятычная накіраванасць мастацкай літаратуры ў гады Вялікай Айчыннай вайны (вершы Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Танка, А. Куляшова, П. Броўкі, апавяданні Кузьмы Чорнага, М. Лынькова). Арганічнае збліжэнне літаратуры для дарослага чытача і дзяцей. Асобныя творы, напісаныя ў вайну для дзяцей: верш Янкі Купалы «Хлопчык і лётчык на вайне» (інтэрпрэтацыя верша «Хлопчык і лётчык»), апавяданне А. Якімовіча «Піянер Геня», зборнік вершаў Эдзі Агняцвет «Міхасёк» і лібрэта дзіцячай оперы «Джанат».

Шляхі развіцця прозы ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе, яе шматтэмнасць і шматжанравасць.

Увага да тэмы Вялікай Айчыннай вайны. Некаторыя аспекты праблемы «дзяцінства і вайна». Дзіцячае бачанне як спосаб выяўлення і асэнсавання рэчаіснасці – кніга пісьмаў-успамінаў дзяцей «Ніколі не забудзем» (1948). Гісторыя стварэння. Вобразы дзяцей і дарослых. Якуб Колас, Янка Брыль пра кнігу.

Дзяцінства ў полымі вайны: трагічныя абставіны і гераізм падлеткаў. Першыя творы на тэму «дзяцінства і вайна» (аповесць «Андрэйка» (1948) П. Кавалёва, «Самыя юныя» (1949) І. Сіўцова, паэмы «Песня пра піянерскі сцяг» (1949), «Будзем сябраваць» (1955) Эдзі Агняцвет, «Алёнчына школа» (1951) К. Кірэенкі, «Ідзі, мой сын» (1953) А. Бялевіча). Недастатковая

псіхалагічная напоўненасць вобразаў як адзін з недахопаў гэтых твораў.

Паказ мужнасці, жыццястойкасці народа ў паэме «Прыгоды дзеда Міхеда» (1956) А. Астрэйкі. Фальклорныя традыцыі ў творы.

Гуманістычны пафас апавяданняў «Завошта?», «Максімка», «Дом пры дарозе» Янкі Маўра. Паказ душэўнай прыгажосці, высакароднасці і чалавечнасці дарослых праз іх адносіны да дзяцей.

Янка Брыль (1917–2006). Старонкі жыцця Янкі Брыля (аповесць пра «мінулага сябра маленства» «Сірочы хлеб», 1942 – 1956). Агульнае ў лёсе Даніка Мальца і будучага пісьменніка.

Эмацыянальнасць, лірызм, высокая культура мовы як характэрныя рысы творчасці Янкі Брыля для дзяцей (кнігі «Ліпа і клёнік», 1949; «Зялёная школа», 1951; «Светлае ранне», 1954). Праблемы маральна-эстэтычнага выхавання ў апавяданнях «Жыў-быў вожык», «Ветэрынар», «Сняжок і Волечка», «Ліпа і клёнік». Услаўленне прыгажосці жыцця ў апавяданнях «Усмешка», «Малітва», «Мы з ім сябры», «Чым накармілі Мішутку». Паэтызацыя працы ў апавяданні «Лазунок». Гуманістычная накіраванасць апавядання «Зялёная школа». Глыбіня пранікнення ў псіхалогію дзяцей.

Вылучэнне дзіцячага пачатку ў асобе дарослага («Як маленькі»). Бачанне навакольнага свету вачыма дзяцей («На сцежцы – дзеці», 1988).

Выступленні пісьменніка па праблемах дзіцячай літаратуры («Слова пра дружбу», «Гледзячы ў чыстыя вочы», «Паэт і чалавек» і інш.).

Здабыткі і пралікі ў распрацоўцы школьнай тэмы (аповесці М. Гамолкі «Лета ў Калінаўцы», 1950, «Добры дзень, школа!», 1953; А. Якімовіча «Гаворыць Масква», 1954; зборнікі апавяданняў П. Кавалёва «Згублены дзённік», 1954; М. Даніленкі «Вернасць слову», 1956; А. Васілевіч «Заўтра ў школу», 1956 і інш.). Уплыў тэорыі бесканфліктнасці.

Зварот да тэмы гістарычнага мінулага ў аповесцях «Базылёў курган» (1954) А. Якімовіча, «Шлях з цемры» (1948–1957) Я. Маўра.

Жанравае ўзбагачэнне пасляваеннай дзіцячай прозы (навукова-фантастычная аповесць «Фантамабіль прафесара Цылякоўскага», 1954, Янкі Маўра, краязнаўчыя нарысы «Па лясных сцежках», 1948, «У лясах над Бярозай», 1955, В. Вольскага).

Наследаванне фальклорных традыцый і наватарства паэтаў. Агляд кніг для дзяцей: «Васількі» (1947) Эдзі Агняцвет, «Рыбы нашых рэк» (1952) А. Вялюгіна, «Маленькім сябрам» (1955) А. Вольскага, «Ластаўкі» (1950), «Сонечная раніца» (1955) Янкі Журбы.

## Тэма 10. Алесь Якімовіч

Алесь Якімовіч (1904–1979). Дзяцінства будучага пісьменніка. Вучоба ў Белпедтэхнікуме, Белдзяржуніверсітэце. Праца настаўнікам.

Удзел у выданні часопіса «Беларускі піянер». Першыя публікацыі і першыя кнігі «Гул бубна» (1925) і «Вершы» (1925). Недахопы ранніх твораў: абстрактнасць, дэкларацыйнасць у адлюстраванні рэчаіснасці.

Уменне пісьменніка дапамагчы юнаму чытачу праз мастацкае слова асэнсаваць важныя падзеі, што адбываліся ў краіне у розныя гістарычныя

перыяды: зборнікі апавяданняў «Залаты зуб» (1937), «Помста» (1946), «Сябры» (1948), «Я – юны піянер» (1952). Рамантызацыя ўчынкаў падлеткаў, што змагаюцца за новыя ідэі, за савецкую ўладу: апавяданні «Юзік» (1935), «Санька»(1947), аповесці «Перамога» (1930), «Незвычайны мядзведзь» (1935). Недахопы твораў: схематызм канфліктаў, ідэалізаванасць характараў герояў. Зварот пісьменніка да маральна-этычных праблем (зборнік апавяданняў «Залатыя рукі», 1975).

Тэма Вялікай Айчыннай вайны ў творчасці А. Якімовіча: аповесць «Смелыя людзі» (1960), апавяданні «Аўтамат» (1945), «Аладкі» (1944), «Чарнавочка» (1947).

Сучаснасць і далёкая гісторыя ў аповесці «Базылёў курган» (1954).

Узросшае майстэрства пісьменніка у 1960 – 1970-я гады. Гістарычная панарама жыцця беларускага народа на працягу 1857 – 1918 гг.: аповесці «Адкуль ліха на свеце» (1963), «Канец сервітуту» (1968), «Кастусь Каліноўскі» (1971), «Цяжкі год» (1976). Пошукі сялянствам шляхоў выхаду з-пад улады варожых сацыяльных сіл. Асаблівасці кампазіцыі тэтралогіі. Мастацкі вымысел і дакументальнасць.

Зварот да вуснай народнай творчасці. Творчая апрацоўка казак: зборнікі «Каток – залаты лабок» (1955), «Бацькаў дар» (1959), «3 рога ўсяго многа» (1959), «Людзей слухай, а свой розум май» (1980), «Андрэй за ўсіх мудрэй» (1983).

Трансфармацыя фальклорных матываў у казках «Каваль Вярнідуб», «Першае яечка», «Пра смелага Вожыка», «Лянота», «Вераб'ёвы госці» і інш.

А. Якімовіч – перакладчык казак А. Пушкіна, С. Маршака, К.Чукоўскага.

Успаміны пісьменнікаў пра А. Якімовіча.

## Тэма 11. Уладзімір Дубоўка

Уладзімір Дубоўка (1900–1976). Дзяцінства будучага паэта паводле аўтабіяграфічных апавяданняў-успамінаў (кніга «Пялёсткі», 1970). Вучоба ў настаўніцкай семінарыі і Вышэйшым літаратурна-мастацкім інстытуце імя В. Брусава. Гады зняволення (1930–1957). Рэабілітацыя (1957).

Першыя творы для дзяцей (казкі «Музыка-чарадзейнік», «Залатое дно»). Супрацоўніцтва ў часопісе «Беларускі піянер» (1924).

Вяртанне ў літаратуру пасля працяглага перапынку. Творчае асваенне традыцый вуснай творчасці народаў свету: зборнікі казак «Цудоўная знаходка» (1960), «Мілавіца» (1962), «Кветкі – Сонцавы дзеткі» (1963), «Залатыя зярняты» (1975). Маральна-этычная праблематыка казак, філасафічнасць зместу. Зварот да праметэеўскіх матываў, услаўленне подзвігу ў імя шчасця грамады («Як Сінячок да сонца лётаў», «Мілавіца»). Паэтызацыя красы і велічы чалавека ў стваральнай працы («Чые рукі прыгажэйшыя», «Хто дужэйшы»). Услаўленне розуму, мудрасці, кемлівасці («Разумная дачка»). Асуджэнне людскіх заган: сквапнасці, эгаізму, прыстасаванства, ашуканства, здрады сяброўству, гультай-ства («Сквапныя мядзведзікі», «Пузыр, Саломіна і Лапаць», «Вожыкаў суд», «Казка пра зачараваную Лілю», «Айога», «Кветкі – Сонцавы дзеткі», «Праўдзівы хлопчык» і інш.) Асаблівасці паэтыкі.

Афарыстычныя выслоўі, іх павучальны сэнс. Арыентацыя мастацкага мыслення паэта на народную мову. Блізкасць твораў У. Дубоўкі да «Казак жыцця» Якуба Коласа і апрацаваных легенд Максіма Танка.

Тэма чалавека і прыроды ў навукова-пазнавальных аповесцях У. Дубоўкі «Жоўтая акацыя» (1967), «Ганна Алелька» (1969) і прыгодніцкай аповесці «Як Алік у тайзе заблудзіўся» (1974). Асаблівасці падачы матэрыялу.

Адлюстраванне ў творах У. Дубоўкі духоўнага вопыту чалавецтва, які патрэбен і нашаму сучасніку.

**Тэма 12. Дзіцячая літаратура 1955 – 1965 гадоў**

Літаратурна-грамадская атмасфера сярэдзіны 1950 – 1960-х гг. Вяртанне на радзіму рэпрэсаваных пісьменнікаў С. Грахоўскага, У. Дубоўкі, А. Пальчэўскага, С. Шушкевіча, А. Звонака, Я. Пушчы. Ідэйныя і эстэтычныя пошукі гэтых аўтараў у літаратуры.

Здабыткі паэзіі Васіля Віткі, С. Грахоўскага, С. Шушкевіча, М. Калачынскага і інш.

Аляксей Пысін (192 –1981). Вобраз роднага краю ў кнігах паэзіі «Матылёчкі-матылі» (1962), «Вясёлка над плёсам» (1964), «Кавылёк» (1966).

Еўдакія Лось (1929–1977). Свет маленства і прыроды ў кнігах «Абутая ёлачка» (1961), «Казка пра Ласку» (1963), «Вяселікі» (1964).

Проза. Узмацненне цікавасці да маральна-этычнай праблематыкі. Кнігі апавяданняў А. Васілевіч «Заўтра ў школу» (1956), «Сябры» (1958); М. Даніленкі «Вернасць слову» (1956); П. Кавалёва «Згублены дзённік» (1954); А. Пальчэўскага «Беражанкі» (1958), «Аля і Галя» (1961), «Дым над лесам» (1964). Прыродазнаўчыя нарысы і апавяданні В. Вольскага «Родны край» (1961).

**Тэма 13. Дзіцячая літаратура 1965 – 1985 гадоў**

Плённае развіццё прозы. Пашырэнне тэматычных абсягаў.

Жанрава-стылявыя пошукі ў адлюстраванні тэмы Вялікай Айчыннай вайны. Творчасць літаратараў – «дзяцей вайны». Трылогія «Мы з Санькам у тыле ворага» (1968), «Мы – хлопцы жывучыя» (1970), «Мы з Санькам – артылерысты...» (1989) Івана Сяркова. Жахі акупацыі вачыма дзяцей. Спалучэнне гераічнага, камічнага і драматычнага. Агульназначнасць зместу асабістага ўспаміну.

Арыентацыя на перажытае ў аповесцях Б. Сачанкі «Апошнія і першыя» (1969), В. Казько «Суд у Слабадзе» (1979). Матывы сіроцтва, трагічных стратаў, болю, памяці.

Споведзь дарослых, якія ў маленстве былі відавочцамі ваенных падзей, ахвярамі ліхалецця – «Апошнія сведкі» (1985) С. Алексіевіч. Янка Брыль пра кнігу.

Творы ваеннай тэматыкі ў чытанні дзяцей (А. Кулакоўскага, М. Гамолкі, Д. Слаўковіча, Г. Бураўкіна, Г. Васілеўскай, А. Кобец-Філімонавай).

Навукова-пазнавальная літаратура. Элементы публіцыстыкі ў ёй. Краязнаўчыя кнігі В. Вольскага «Падарожжа па краіне беларусаў» (1968), «Палессе» (1971). Цыклы прыродазнаўчых нарысаў пісьменніка «Лёс Дункана» (1978), «Дзень добры, Бяроза» (1984).

«Зямля над белымі крыламі» (1977) У. Караткевіча – эмацыянальна-ўзнёслы сказ пра Беларусь. Нарыс пісьменніка «Белавежская пушча» (1975).

Традыцыйныя вобразы, матывы і наватарства У. Караткевіча-казачніка («Казкі», 1975).

Вядучыя матывы, вобразы літаратуры для дзяцей гэтага перыяду. Агляд творчасці Д. Слаўковіча, П. Рунца, П. Кавалёва, В. Хомчанкі, М. Янчанкі.

Лірычнасць, нацыянальная адметнасць прозы Клаўдзіі Каліны (1927 – 1994). Малюнкі прыроды, свет дзяцінства, казачныя матывы ў кнігах «Каляровыя месяцы» (1975), «Світанак», «Бабуля Насця, дзед Адам, Петрык і каза Рагуля» (1985).

Свет дзяцінства ў апавяданнях В. Гарбука (зб. «Незнарок і знарок», 1969; «Такіх кветак не бывае», 1971; «Горад без папугайчыкаў», 1983), У. Юрэвіча (зб. «Тараскавы турботы», 1966; «Дзе начуе сонца», 1970; «Нястрашны страх», 1986).

Спалучэнне фантастычнага з рэальным у казках Н. Тулупавай (зб. «Бізоны-рабінзоны», 1983).

Паэзія. Жанрава-тэматычная разнастайнасць. Багацце творчых індывідуальнасцей.

Сяргей Грахоўскі (1913–2002). Гуманістычная скіраванасць, пропаведзь дабра і справядлівасці ў творах паэта (зб. «Ад вясны да вясны», 1959; «Сёння і заўтра», 1961; «Гарыць касцёр», 1966; «Сонечная сцежка», 1980; «Знаходка», 1985). Гумар, арыгінальнасць сюжэтаў, асаблівасці рыфмоўкі ў вершах паэта.

Анатоль Грачанікаў (1938–1991). Праца ў рэдакцыях дзіцячых часопісаў «Вясёлка», «Бярозка». Уплыў беларускага фальклору на творчасць паэта.

Праблема прызначэння і ўздзеяння мастацтва ў «Казцы пра Івана-ганчара і пачвару цара» (1980). Матывы дабраты, сумленнасці ў казках «Чорны замак», «Жывая вада» (зборнік «Жывая вада», 1985).

Тэматычная разнастайнасць паэзіі А. Грачанікава.

Алег Лойка (1931–2008). Свет дзяцінства і прыроды ў вершах паэта (кнігі «Як Тоня рэха шукала» (1962), «Карагод дзівосных прыгод» (1966), «Каля млына» (1972), «Дзе хто начуе?» (1977). Займальнасць сюжэта, метафарычнасць мовы, цеплыня інтанацый, меладычнасць паэтычнага радка.

Васіль Зуёнак (нарадзіўся ў 1935). Народныя ідэалы дабрыні, сумленнасці, прыгажосці ў вершах, казках і жартах паэта (кніга «Хата, поўная гасцей», 1987). Загадкі В. Зуёнка пра звярыны, птушыны і раслінны свет («Сонечны клубочак», 1972). Тонкае адчуванне гукаў, колераў, фарбаў жывой народнай мовы. Характэрныя прыкметы паэзіі В.Зуёнка – рытмічная разнастайнасць, лёгкасць гучання, імклівасць, насычанасць дзеяннем.

Агляд паэтычных зборнікаў: Л. Геніюш «Казкі для Міхаські» (1979), «Добрай раніцы, Алесь» (1976), А. Пысіна «Колькі сонцаў» (1979), І. Муравейкі «Няхай сонца не заходзіць» (вершы, паэмы, казкі, 1981), «Я прыдумаў казку» (1985); А. Дзеружынскага «Той, хто працуе» (1984), Н. Галіноўскай «Кніжчыны сябры» (1975), «Мой дзень» (1977), М. Чарняўскага «Дзе пяцёркі прадаюцца» (1978), «Звініць званок», (1982), П. Пранузы «Фарбы восені» (1982), В. Лукшы «Зялёная бальніца» (1974), «Лета – круглы год» (1978). Зварот да фальклору і

пошукі новых жанравых форм.

Драматургія для дзяцей. Гераічныя п'есы А. Махнача («Шпачок», 1963; «Гаўрошы Брэсцкай крэпасці», 1969), В. Зуба («Марат Казей», 1963; «Юнацтва рыцара», 1972). Адметная сюжэтна-вобразная структура п'ес А. Вярцінскага «Дзякуй, вялікі дзякуй!» (1983), Г. Каржанеўскай «Іван Світаннік» (1981), «Шукайце кветку-папараць» (1985).

## Тэма 14. Максім Танк

Максім Танк (1912–1995). Першыя творы Максіма Танка для дзяцей у заходнебеларускіх часопісах «Беларускі летапіс» і «Снапок». Увага паэта да вуснай народнай творчасці. Агляд кнігі «Блікі сонца» (1997).

Тэматыка і праблематыка твораў Максіма Танка для дзяцей. Услаўленне смеласці і самаахвярнасці ў барацьбе за праўду і справядлівасць («Сказ пра Вяля»). Ідэя непераможнасці мастацтва («Казка пра Музыку»). Народная легенда пра музыку ў апрацоўцы М. Багдановіча, Я. Купалы, Я. Коласа, З. Бядулі, У. Дубоўкі і Максіма Танка. Вершаваная апрацоўка народных казак «Конь і Леў», «Галінка і верабей», «Ехаў казачнік Бай», «Журавель і чапля». Маральна-этычныя праблемы ў гэтых казках. Праблемы таварыскасці, сціпласці ў творах з уласна аўтарскім сюжэтам («Жук і слімак», «Мухамор». «Казка пра мядзведзя», «Сярод лясоў наднёманскіх»). Сцвярджэнне неабходнасці беражлівых адносін да прыроды ў казках «Калі вясна прыйшла», «Быль пра злога Сухавея». Напаўненне традыцыйнага казачнага сюжэта сучасным зместам – «Быліна пра касмічнае падарожжа Мураша Бадзіні». Спалучэнне рэальнага і неверагоднага ў творах паэта.

Тонкае разуменне асаблівасцей дзіцячага ўспрымання свету: вершы «Падслуханае», «Слімак», «Божыя кароўкі», «Магчыма, не чулі», «Чаму птушкі лётаюць», «Красуня», «Света», «Мама» і інш.

«Лемантар» Максіма Танка як вандроўка па моўных сховах. Метафарычнасць, казачная асацыятыўнасць, нацыянальны каларыт твораў паэта.

## Тэма 15. Станіслаў Шушкевіч

Станіслаў Шушкевіч (1908–1991). Маленства паэта. Вучоба ў Мінскім педагагічным тэхнікуме, Вышэйшым педагагічным інстытуце. Праца ў бібліятэках і рэдакцыях рэспубліканскіх газет. Неабгрунтаваныя арышты і высылкі ў Сібір (з 1936 г., двойчы). Вяртанне на радзіму (1956). Канчатковая рэабілітацыя (1975).

Пачатак літаратурнай дзейнасці (зборнік «Вершы», 1934). Рамантычная акрыленасць, услаўленне праяў штодзённага жыцця, метафарычнасць мовы як адметныя рысы паэзіі С. Шушкевіча 1920–1930-х гадоў. Першыя крокі ў дзіцячай літаратуры – казка «Звярыны баль» (1929). Невыразнасць ідэі. Новая рэдакцыя твора (1936).

Працяг літаратурнай дзейнасці пасля доўгага перапынку. Арыентацыя паэта на фальклорныя традыцыі. Вобразы беларускай фауны і флоры як скразныя ў кнігах для дзяцей: «Лясная калыханка» (1958), «Сарочы церамок» (1959), «Колькі кіпцікаў у кошкі» (1972), «Барадаты камар» (1977), «Едзе страшная Яга» (1985), «Казёл на верталёце» (1987). Драматычная напружанасць

сюжэта, камізм сітуацый, гульнёвыя элементы, займальнасць і павучальнасць, псіхалагічная выразнасць казак («Хворы жораў», 1957, «Камар-брынкун і жаба-квакуха», 1959, «Ліса едзе на кірмаш...», 1959, «Пра Лісу-хітруху і добрых сяброў Мядзведзя, Зайца і Пеўніка», 1960, «Конік і Страказа», 1960). Прыём антрапамарфізму. Напаўненне традыцыйных казачных сюжэтаў новым зместам, набліжэнне да сучаснасці (зб.»Ліса з магнітафонам», 1979). Маральна-этычныя праблемы ў вершах («Хрыпаты пеўнік», «Свавольнікі», «Каля лесу ехаў зайка», «Пайшоў коўзацца каток», «Танцавалі ў сшытку кляксы», «Непамыцька – хлопчык Віцька», «Трутні», «Чартапалох і чыстацел» і інш.). Сатыра і гумар у вершах.

Тэма працы (вершы «Пчала-госцейка лятала», «Мурашнік», «Казка-быль пра рэпку», «Муха-папрадуха», «Трутні», «Працавітыя швачкі» і інш.).

Паэтызацыя прыроды («Ляціце, птахі», «Вясна прыйшла», «Лістапад», «Усё зіма заснежыла», «Кветкі-званочкі» і інш.).

Вершы-жарты («Парсючок», «Гарбуз», «Колькі кіпцікаў у кошкі», «Журавы», «Рагатыя бэкі-мэкі», «Збіралася ліса ў госці» і інш.).

Асаблівасці паэтыкі вершаў С. Шушкевіча: канкрэтнасць паэтычнага вобраза, дакладнасць рыфмы, інтанацыйнае багацце, меладычнасць.

## Тэма 16. Васіль Вітка

Васіль Вітка (1911–1996). Паэт пра сваё маленства, пра настаўнікаў у жыцці і літаратуры. Праца ў рэдакцыях рэспубліканскіх газет і часопісаў. Шматграннасць таленту.

Гістарычны лёс беларускага народа, яго мінулае, сучаснае і будучае, сцвярджэнне народа ў праве на сваю бацькаўшчыну, на сваю нацыянальную годнасць як асноўныя тэмы творчасці паэта.

Далучэнне да дзіцячай літаратуры. Гісторыя стварэння першай казкі для дзяцей «Вавёрчына гора» (1947). Пафас дзейснай дабраты, узаемадапамогі, калектывізму, народна-песенная вобразнасць, прыём антрапамарфізму. Казкі «Буслінае лета» (1957), «Казка пра цара Зубра» (1959), «ППШ» (1962), «Генерал Верабей» (1962), «Дударык» (1962), «Азбука Васі Вясёлкіна» (1963), «Казкі і краскі» (1984) і інш. Творчае выкарыстанне народных матываў, сюжэтаў, вобразаў, моўна-выяўленчых сродкаў.

Вершаваныя жанры дзіцячага фальклору (калыханкі, пацешкі, лічылкі, загадкі, скорагаворкі) у апрацоўцы Васіля Віткі (зборнікі «Дударык» 1964; «Чытанка-маляванка», 1971; «Ладачкі-ладкі», 1977; «Дом, дзе жывуць словы», 1995; «Урокі роднага слова», 2008). Творы з уласна аўтарскім сюжэтам у кнігах («Праводзіны снежнай бабы», «Забіякі», «Карусель», «Іванка» і інш.). Вершы пра птушак (кніга «Госці», 1984). Трапна заўважаныя асаблівасці выгляду і звычак птушак.

Майстэрства Васіля Віткі як апавядальніка («Зайчык-вадалаз», «Чмяліны мёд», «Трывога ў Ельнічах» і інш.). Юны герой у розных дачыненнях да людзей і прыроды.

Паэма «Беларуская калыханка» (1968) як патрыятычная песня ў гонар маці Радзімы і яе бессмяротных сыноў. Умоўнасць і сімволіка.

Высокая паэтычная культура, спалучэнне заснаваных на народна-паэтычнай глебе займальнасці і пазнавальнасці як адметныя рысы творчасці Васіля Віткі.

Выступленні паэта па праблемах выхавання дзяцей і развіцця дзіцячай літаратуры. Кнігі педагагічных роздумаў «Дзеці і мы» (1977), «Урокі» (1982), «Азбука душы» (1988). Клопат пісьменніка пра садружнасць дзіцяці і свету прыроды. Выхаванне любові да слова і адчування яго хараства.

Васіль Вітка – лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, лаўрэат Ганаровага дыплома імя Г. Х. Андэрсена.

**Тэма 17. Алена Васілевіч**

Алена Васілевіч (1922–2021). Старонкі жыцця А. Васілевіч паводле тэтралогіі «Пачакай, затрымайся» (1972). Сюжэтна-кампазіцыйныя асаблівасці. Паказ духоўнага станаўлення, фарміравання светапогляду Ганькі Гурыновіч. Увасабленне ў вобразе Ганькі тыповых рыс моладзі 1920–1930-х гадоў. Дасканаласць мастацкага адлюстравання тагачаснага жыцця. Асаблівасці стылю.

Пошукі свайго шляху ў літаратуры (аповесці «У прасторах жыцця», 1947; «Шляхі-дарогі», 1950). Аналітычнасць і псіхалагізм прозы А. Васілевіч: зборнікі апавяданняў «Заўтра ў школу» (1956) «Сябры» (1958), «Апавяданні» (1959), «Калінавая рукавічка» (1963), «Шурка Рэмзікаў» (1985).

Маральна-этычная праблематыка апавяданняў «Шурка Рэмзікаў», «Сябры», «Вернісаж», «Арфа» і інш. Тэма «чалавек і прырода» ў апавяданнях «Браты-артысты», «Геша», «Бабуліны кватаранты», «Калінавая рукавічка» і інш. Раскрыццё ўнутранага свету дзяцей. Сюжэтнасць і эмацыянальнасць апавяданняў.

Успаміны А. Васілевіч пра Я. Коласа, І. Мележа, Я. Маўра, М. Лынькова (кніга «Люблю, хвалююся – жыву», 1986).

**Тэма 18. Эдзі Агняцвет**

Эдзі Агняцвет (1913–2000). Тэматычная і жанравая шматстайнасць творчасці Эдзі Агняцвет: кнігі «Мы сур'ёзныя, мы вясёлыя» (1976), «Доктар Смех» (1977), «Ад зярнятка да вясёлкі» (1981), «Хто пачынае дзень?» (1982), «На двары алімпіяда» (1984), «Рэчка, рэчанька мая» (1991), «Хай часцей смяюцца дзеці» (1997), «Пад сінім небасхілам» (1999).

Паэтызацыя працы (вершы «Мой тата – будаўнік», «Машыніст», «Вясёлка», «Хто пачынае дзень?», «Цагліна», «Скульптар» і інш.). Пейзажныя вершы («Музыка лесу», «Падарожнік», «Дажджы» і інш.). Тэма аховы прыроды («Рабінка», «Чаму ў трывозе дзед Мароз», «Рэчка, рэчанька мая» і інш.). Тэма міру і дружбы («Самае-самае неабходнае», «Мы – дзеці дружбы, мы – дзеці міру»). Сатырычна-гумарыстычныя вершы («Параска і падказка», «На дачы ў гамаку», «Шчодры Цішка», «Вельмі ветлівы Мікіта» і інш.). Асуджэнне гультайства, сквапнасці, ганарлівасці. Разнастайнасць адценняў камічнага: ад мяккага гумару да самакрытычнай іроніі. Высокая арганізацыя паэтычнага радка, меладычнасць вершаў паэтэсы.

Тэма Вялікай Айчыннай вайны ў творчасці Эдзі Агняцвет.

Дакументальная аснова, асаблівасці кампазіцыі паэм «Песня пра піянерскі сцяг», (1949), «Будзем сябраваць», (1979). Гуманістычны пафас, сучаснае і мінулае ў паэмах «Незвычайныя канікулы» (1962) і «Васіль Сяргеевіч» (1978).

Выступленні Эдзі Агняцвет па праблемах развіцця дзіцячай літаратуры (артыкулы «З думай аб юным чытачы». «Каб сэрцы юныя ўсхваляваць», «Літаратура для дзяцей і юнацтва» і інш.).

**Тэма 19. Артур Вольскі**

Артур Вольскі (1924–2002). Наватарскія пошукі ў галіне тэм і жанраў. Аналіз кніг «Чарнічка» (1964), «Рагатка» (1971), «Што такое мікра тое» (1971), «Лясныя мастакі» (1973), «Ізумрудавы горад, дзе ты?..» (1977), «Еду ў госці да слана» (1978), «Сонца блізка ўжо зусім» (1984), «Дабяруся да нябёс» (1985), «Карусель» (1996), «Адэльчыны ручнікі» (2002).

Спалучэнне паэзіі, прозы і драматургіі ў некаторых творах паэта («Рагатка», «Лясныя мастакі», «Сцяпан – Вялікі Пан»). Вобраз Беларусі ў кнізе «Ізумрудавы горад, дзе ты?..» Вобраз «малой радзімы» ў вершы «Татаў родны кут». Рэальнае і фантастычнае ў казцы «Што такое мікра тое». Асацыятыўная вобразнасць. Паэтызацыя прыроды ў вершах «Дождж», «Едзе хмарка», «Ялінка», «Зімовае сонца», «Зялёны бор», «Чарнічка», «Маліна» і інш.). Прыём антрапамарфізму ў вершах «Коцік», «Козачка», «Бегемоцік», «Зебра» і інш. Гумарыстычныя вершы «Захварэў парсючок», «Караблікі», «Чаму Рыгорка мыкаў», «Што чарніла нарабіла» і інш. Займальнасць сюжэтаў, казачнасць.

Тэма хлеба як чалавечай каштоўнасці («Хлеб – усяму галава», 1989). Асаблівасці азбук «Жывыя літары» (1973), «Ад А да Я – прафесія мая» (1987). Інтэрпрэтацыя сюжэтаў вядомых казак Ш. Перо пра Чырвоны Каптурок і «Кот у ботах». Фальклорная аснова, выхаваўчая накіраванасць п'ес «За лясамі дрымучымі» (у сааўтарстве з П. Макалём, пастаўлена ў 1958 г.), «Марынка-крапіўніца» (у сааўтарстве з П. Макалём, пастаўлена ў 1963 г.), «Сцяпан – вялікі пан» (1979, пакладзена на музыку Ю. Семянякам і пастаўлена ў 1979 г. на сцэне Мінскага тэатра музычнай камедыі), «Тры Іваны – тры браты» (1985), «Граф Глінскі-Папялінскі» (1986), «Каб не змаўкаў жаваранак» (1989).

**Тэма 20. Ніл Гілевіч**

Ніл Гілевіч (1931–2016). Фальклорныя матывы і жанры ў паэзіі Ніла Гілевіча. Займальнасць, мастацкая дасканаласць загадак (зборнікі «Сіні домік, сіні дом», 1961; «Загадкі», 1971). Свет прыроды і дзяцінства ў вершах «Вітаю вясну», «Дождж-грыбасей», «У лузе», «Зімой у лесе», «Зёлкі» і інш. (зб. «Дождж-грыбасей», 1966; «Калі рана ўстанеш», 1984; «Добры чалавек», 1987; «Шчаслівыя хвіліны», 2001; «Я – беларус», 2008). Мастацкае асэнсаванне пачуцця гонару за права «беларусам звацца» – верш «Казачная зямля».

Творы, напісаныя Н. Гілевічам па матывах балгарскай дзіцячай паэзіі («Казка пра самалёт», «Белы мядзведзь у заапарку», «Песня пра ручаёк», «Перапалох», «Бяроза і дуб», «Ленка» і інш. – кніга «Добры чалавек»).

**Тэма 21. Рыгор Барадулін**

Рыгор Барадулін (1935–2014). Жанравая разнастайнасць паэзіі Р. Барадуліна (вершы, калыханкі, пацешкі, жарты, скорагаворкі, лічылкі, задачкі,

загадкі, казкі). Здольнасць паэта гуляць словам, уменне віртуозна карыстацца гукапісам, каламбурыць. Агляд кніг: «Ай! Не буду! Не хачу!» (1971), «Што было б тады б, калі б?» (1977), «Ці пазяхае бегемот?» (1981), «Індыкала-кудыкала» (1986), «Кобра ў торбе» (1990), «Грышка, Мішка і Шчыпай ехалі на чоўне» (1996), «Як воўк калядаваў» (2000), «Выпаў грук у грома з рук» (2009), «Сябрына» (2013). Асаблівасці азбук «Азбука не забаўка» (1985), «Азбука – вясёлы вулей» (1994).

Спосабы актывізацыі мастацкага мыслення дзяцей: вершы-пытанні, камічныя сітуацыі («Ці пазяхае бегемот?», «Хто дагары нагамі?», «Ці аса, ці куса?», «Як быць?», «Ты чуў? Ты чула?», «Пільная патрэба», «Рэгуліроўшчык», «Ён, яна, яно, яны», «Як стаў заяц даўгавухі», «Буду ўрачом»). Наватарства формы твораў. Вершы-загадкі («Загадкі на градках», «Кош загадак»), скорагаворкі («Скорагаворка са скорагаварчаняткам», «Вымаві!»), задачкі («Палічы!», «Як сурок лічыў сарок?», «Колькі кошак у кашы?», «Колькі важыць зайцаў цень?», «Колькі сарок?», «Колькі мае ног?»), дражнілкі («Як дражніць бубнілу?», «Пыталава»), прыбабунькі («Не столькі мліва, колькі дзіва»). Вершы-каламбуры («Што было б тады б, калі б?», «Колькі раніц месціць ранец?», «На шашы», «Варголы» і інш.).

Свет маленства ў вершах «Ай! Не буду! Не хачу!», «Раскідач», «Пытанне ўсім» і інш. Вершы пра жывёл і птушак («Экзамен», «Ці ляцяць вароны ў вырай?», «Пеўнік-весялун» і інш.). Трапнасць характарыстык. Прыём антрапамарфізму. Лірычнасць пейзажных замалёвак («Як восень дрэвы ашукала», «Зіма», «Коцікі», «Босы дождж»).

Традыцыі фальклору і наватарскія пошукі паэта ў жанры казкі («Бабуліна казка», «Мех шэрых, мех белых», «Не паслухаў зайчык маму», «Бо б да неба вырас боб...», «Як воўк калядаваў», «Залатая прасніца»). Роля паэзіі Р. Барадуліна ў абуджэнні цікавасці да роднага слова, чуйнасці да яго гучання, выхаванні ў дзяцейназіральнасці і пачуцця прыгожага.

## Тэма 22. Павел Місько

Павел Місько (1931–2011). Пазнавальны і выхаваўчы патэнцыял апавяданняў П. Місько пра прыроду «Восеньскім днём», «Лясныя дарункі» і інш. Маральна-этычная праблематыка апавяданняў «Добры чалавек», «Каляндар сумлення».

Гумарыстычная аповесць «Навасёлы, або Праўдзівая, часам вясёлая, часам страшнаватая кніга пра незвычайны месяц у жыцці Жэні Мурашкі» (1972). Элементы прыгодніцтва ў творы.

«Напаўфантастычныя» аповесці «Прыгоды Бульбобаў» (1977), «Грот афаліны» (1985), «Эрпіды на планеце Зямля» (1987). Праблемы сяброўства, чалавечых узаемаадносін у творах.

Казачныя прыгоды ў кнізе «Прыйдзі, дзень-залацень!» (1993).

## Тэма 23. Уладзімір Ліпскі

Уладзімір Ліпскі (нарадзіўся ў 1940 г.). Звесткі з біяграфіі У. Ліпскага. Рэдактарская дзейнасць у часопісе «Вясёлка». Ул. Ліпскі – лаўрэат Літаратурных прэмій імя Янкі Маўра (1993), імя Васіля Віткі (1997),

Дзяржаўнай прэміі (2000).

Дзіцячы свет у апавяданнях У. Ліпскага (зб. «Рыгоркавы прыгоды», 1974; «Марынчына казка», 1977). Псіхалагізм, жыццёвасць сітуацый, адметнасць вобразаў.

Арыгінальныя сюжэты, казачная плынь, прыгодніцкія элементы ў аповесцях «Рыгоркавы прыгоды», «Клякса-Вакса і Янка з Дзіўнагорска», 1982; «Пра Андрэйку Добрыка і чорціка Дуроніка», 1993; «Каралева белых прынцэс», 2000. Элементы гульні ў казцы-забаўлянцы «Вясёлая азбука» (1992). «Забаўлянкі і апавяданні, былі і небыліцы, казкі і загадкі – для Машы і ўсіх дзяцей нашых» – кніга «Наша Маша» (2001).

Пазнавальны і выхаваўчы патэнцыял кніг «Азбука жыцця» (2010), «Я тут жыву: дзецям пра Беларусь» (2008), «Свіцязянская русалка» (2009), «Вясёлка над Нёманам» (2011).

## Тэма 24. Георгій Марчук

Георгій Марчук (нарадзіўся ў 1947 г.). Тэматычная і жанравая разнастайнасць творчасці Г. Марчука. Мастацкая каштоўнасць, педагагічная накіраванасць казак, п’ес, навел. Агляд кнігі «Чужое багацце» (2012).

Традыцыі фальклору і наватарскія пошукі пісьменніка ў жанры казкі. Агляд кніг казак «Дзікая груша» (2000), «Прыгоды Агапкі і ката Фокуса» (2012). Элементы прыгодніцтва і паэтыка, напаўненне казачных сюжэтаў новым зместам, набліжэнне да сучаснасці.

## Тэма 25. Уладзімір Ягоўдзік

Уладзімір Ягоўдзік (нарадзіўся ў 1956 г.). У. Ягоўдзік – заснавальнік і рэдактар дзіцячага часопіса «Лесавік», рэдактар газеты «Дзеці і мы».

Зварот У. Ягоўдзіка да народных скарбаў (кнігі «Сонейка, свяці!», 1988; «Заклятыя скарбы», 1992; «Вужовы кароль», 1996).

Тэма далёкага мінулага Беларусі ў гісторыка-пазнавальнай кнізе «Сем цудаў Беларусі» (1999).

Фальклорная аснова твораў, прысвечаных роднай прыродзе (кнігі «Ці вернецца князь Кук?», 1993; «У царстве Вадзяніка», 1995; «Дзівосны карабель», 1995; «Птушыная дарога», 2002; «Жывая вада крыніц», 2009; «Вячэра для вожыка», 2013; «Год-карагод», 2013 і інш.). Выхаванне экалагічнай культуры і цікавасці дзяцей да пазнання прыроды.

Маральна-этычная праблематыка п’ес-казак «Сонейка, свяці!», «Залатое зярнятка», «Сакрэты Вогніка», «Калі тупне зайка...», «Усміхніся, прынцэса!».

## Тэма 26. Дзіцячая літаратура на сучасным этапе: проза, паэзія, драматургія

Пашырэнне жанрава-тэматычных абсягаў у прозе, паэзіі, драматургіі.

Гістарычнае мінулае і сённяшні дзень роднай зямлі, непаўторная прырода Беларусі ў кнігах Я. Пархуты «Зямля бацькоў нашых» (1988), У. Ліпскага «Я тут жыву: дзецям пра Беларусь» (2008), А. Бензярука «Свята для сэрца» (2009), В. Гардзея «Малая дзіцячая Чырвоная кніга» (2010), «Лясная кніга ў творах беларускіх пісьменнікаў» (укладальнік А. Бадак, 2008), «Блакітная кніга ў творах беларускіх пісьменнікаў» (укладальнік А. Масла, 2009), «Галасы

старажытных падарожнікаў» (пераказаў У. Ягоўдзік, 2013). Асэнсаванне гісторыі беларускага народа ў творах У. Бутрамеева, У. Арлова, С. Тарасава. Агляд кнігі «Вялікія і славутыя людзі беларускай зямлі» (укладальнік І. Клепікаў, 2010).

Узмацненне казачнага пачатку ў прозе А. Бадака «Незвычайнае падарожжа ў краіну ведзьмаў» (2001), В. Шырко «Дзед Манюкін не салжэ» (1990), «Дзед Манюкін і ўнукі» (2003). Спалучэнне фантастычнага з рэальным у творах «Галенчына «Я», або Планета Цікаўных Хлопчыкаў» (1990) Р. Баравіковай, «Радасці і нягоды залацістага карасіка Бубліка» (2004) А. Савіцкага.

Сінтэз паэзіі і прозы ў кнізе В. Зуёнка «Бадзірог» (1995): «карагод вясёлых прыгод – і рыфмай звязаных, і проста расказаных». Агляд кнігі В. Зуёнка «Рэха» (2003).

Сучасная літаратурная казка і яе асаблівасці. Казкі А. Масла, Г. Аўласенкі, У. Ліпскага, М. Маляўкі, Р. Баравіковай, У. Мацвеенкі, Л. Рублеўскай, А. Бадака, А. Жука, А. Зэкава, А. Бутэвіча, С. Мінскевіча, Л. Улашчанкі, А. Якімовіча, Р. Бензярука. Агляд кніг серыі «Казкі XXI стагоддзя», серыі «Беларуская аўтарская казка» («Чароўныя пацеркі», 2006, «Вежа міру», 2007, «Крынічка Буль-Буль», 2010).

Характэрныя асаблівасці сучаснай паэзіі – творчае развіццё фальклорных традыцый на новай, адпаведнай нашаму часу, аснове. Жанравае багацце паэзіі – казкі, паэмы, вершы, калыханкі, пацешкі, загадкі, задачкі, скорагаворкі, песні. Шырыня тэматыкі: вершы аб Радзіме, прыродзе, працы, пра дзяцінства. Педагагічная накіраванасць, гумар і лірызм твораў, даступнасць дзіцячаму ўспрыманню.

Нацыянальная адметнасць твораў В. Жуковіча (зб. «Гуканне вясны», 1992; «Свет – дзівосны», 2000), У. Карызны («Іграй, жалейка, не змаўкай…», 1998), Л. Пранчака («Дзяўчынка-беларуска», 1993; «Цік-так ходзікі», 2001), В. Лукшы «Адзіны ў свеце край» (2004), М. Пазнякова («У родным краі», 2009; «Радзіма», 2012).

Агляд паэтычных зборнікаў: А. Дзеружынскага «Жывая азбука» (1995), І. Курбекі «Хітрыя літары» (2004), М. Чарняўскага «Сонечны кошык» (2009), «Колькі ў сонейка сяброў!» (2009), «Як зрабіць вясёлым дзень» (2012), У. Паўлава «Хто знае – адгадае» (1997), «Згадка на дабро» (2004), В. Гардзея «Зайкава балалайка» (1998), М. Маляўкі «Марфутка-імянінніца» (2008), У. Мацвеенкі «Дабранач» (2003), «Староначкі з моўнай скарбоначкі» (2008), У. Мазго «Цуда-вуда» (2008), «Загадкавая азбука» (2012), «Лепшыя сябры» (2012), М. Пазнякова «Песня прыроды» (2012), «У бары і на двары» (2012), Н. Галіноўскай «Звяры ў трамваі» (2013) і інш.

Драматургія для дзяцей. Фальклорныя матывы, вобразы, элементы прыгодніцтва ў п’есах В. Лукшы «Чароўны камень» (1984), С. Кавалёва «Хохлік» (1994), З. Дудзюк «Жывая вада» (1994), «Дудка-самагудка» (2001), П. Васючэнкі і С. Кавалёва «Дзівосныя авантуры паноў Кубліцкага ды Заблоцкага» (1992), П. Васючэнкі «Новы калабок» (1996), «Страшнік Гам»

(1994), Г. Каржанеўскай «Шукайце кветку-папараць» (2004), С. Кавалёва «Жабкі і Чарапашка» (1991), «Вандраванне ў Княства Сноў» (2009). Адметная сюжэтна-вобразная структура п'ес.

Зварот да жанру «фэнтэзі»: «Канікулы на астэроідзе», «Сінязорка» З. Дудзюк, «Міжпланетны пажарнік», «Шкляныя горы, альбо Праграміст Чароўнай даліны» Р. Баравіковай, «Кацярынка і Кэт» П. Васючэнкі, «Калі прыляцелі іншапланецяне» Т. Мушынскай. Спробы ўвасаблення «рыцарскай тэмы» ў п’есах П. Васючэнкі «Маленькі збраяносец» (1997), С. Кавалёва «Драўляны рыцар» (1995), Л. Рублеўскай «Янук, рыцар Мятлушкі» (1994).

Экалагічныя праблемы ў п’есах «Каляровая затока» П. Васючэнкі, «Кветкі пад ліўнем» І. Сідарука, «Зімовая песня жаўрука» Г. Марчука. Чалавек і прырода ў п’есе «Чароўны гадзіннік» («Гадзіннік Лікбога») З. Дудзюк. Знаходкі ў наследаванні традыцый сусветнай літаратуры.

Выкарыстанне літаратурных крыніц для стварэння новых узораў сцэнічных твораў для дзяцей: «Чарнакніжнік» С. Кавалёва – «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях» Я. Баршчэўскага, «Спадчына бабулі Зімавухі» Л. Рублеўскай – «Снежная каралева» Х.К. Андэрсена, «Зорны хлопчык» Г. Каржанеўскай – «Маленькі прынц» Антуана дэ Сент-Экзюперы, «Віртуальнае зубраня» І. Сідарука – эпізоды з паэмы М. Гусоўскага «Песня пра зубра», «Заяц варыць піва» С. Кавалёва – аднайменны верш У. Караткевіча і казка «Верабей, сава і птушыны суд», «Як птушкі дуб ратавалі» Г. Каржанеўскай – «Казкі жыцця» Якуба Коласа.

Мастакі-ілюстратары дзіцячых кніг. Удзел у афармленні выданняў для дзяцей Т. Беразенскай, Я. Куліка, А. Лось, Н. Паплаўскай, У. Жука, У. Пашчасцева і інш. Пошукі мастацкай выразнасці, адлюстраванне ў пейзажах прыгажосці, багацця фарбаў роднай прыроды.

Перыядычны друк для дзяцей. Часопіс «Вясёлка»: асноўныя рубрыкі, тэматыка.

**ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА**
**ДЫСЦЫПЛІНЫ «БЕЛАРУСКАЯ ДЗІЦЯЧАЯ ЛІТАРАТУРА»**

| Нумар тэмы, раздзела | Назва тэмы, раздзела | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | Матэрыяльнае забеспячэнне заняткаў (нагладныя, метадычныя дапаможнікі і інш.) | Літаратура | Формы кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | лекцыі | практычныя (семінарскія) заняткі | лабараторныя заняткі | самастойная работа студэнта | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| I | **Беларуская дзіцячая літаратура** | **28** | **28** | | **44** | | | |
| 1. | **Уводзіны. Вытокі беларускай дзіцячай літаратуры** | **1** | | | 1 | | | |
| | 1. Паняцце аб дзіцячай літаратуры і дзіцячым чытанні. Спецыфіка літаратуры для юнага чытача. Роля мастацкага афармлення кніг для дзяцей адпаведнага ўзросту.<br>2. Пытанні тэорыі дзіцячай літаратуры. Пераасэнсаванне некаторых тэарэтычных праблем ва ўмовах сучаснага жыцця.<br>3. Перыядызацыя беларускай дзіцячай літаратуры.<br>4. Агляд вучэбнай і крытычнай літаратуры па курсе. | 1 | | | 1 | Беларуская дзіцячая літаратура: вучэб. дапам. / Пад рэд. А.М. Макарэвіча, М.Б. Яфімавай. Мінск., 2008 | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[4]<br>[5] | |
| 2. | **Дзіцячая літаратура пачатку XX стагоддзя** | **1** | **2** | | 1 | | | |
| 2.1. | 1. Беларускае нацыянальнае адраджэнне. Адкрыццё нацыянальных школ, легалізацыя беларускага друку (выхад газет «Наша доля», Наша ніва» ).<br>2. «Беларускі лемантар» (1906) — першая кніга для навучання дзяцей роднай мове. Пытанне аб аўтарстве.<br>3. Цётка. Асветніцкая дзейнасць пісьменніцы, яе роля ў станаўленні літаратуры для дзяцей.<br>4. «Другое чытанне для дзяцей беларусаў» (1909) Якуба Коласа. Кампазіцыя кнігі. Ідэйна-тэматычнае і жанравае багацце твораў чытанкі, іх гуманістычны змест.<br>5. Кандрат Лейка, Францішак Аляхновіч – пачынальнікі нацыянальнай драматургіі для дзяцей. | 1 | | | 1 | Камп'ютарная прэзентацыя № 1 | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[4]<br>[5] | |
| 2.2. | 1. Цётка «Першае чытанне для дзетак беларусаў» (1906). Тэма жыцця беларускай вёскі як асноўная тэма твораў чытанкі («Нядзеля», «Наша гаспадарка», «Мая вёска» ). Гуманістычны змест апавядання «Міхаська».<br>2. «Другое чытанне для дзяцей беларусаў» (1909) Якуба Коласа. Кампазіцыя кнігі. Ідэйна-тэматычнае і жанравае багацце твораў чытанкі<br>3. Кандрат Лейка. Казачны сюжэт п'есы «Снатворны мак» (1912). Павучальны змест твора. | | 2 | | | Чытанкі Цёткі, Якуба Коласа (факсімільныя выданні)<br>CD-дыск “Максім Багдановіч. Вершы”. Чытае засл. артыст РБ Віктар Мінаеў | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[4]<br>[5] | Слуханне вершаў у выкананні В.Мінаева |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 4. Францішак Аляхновіч. Ідэйна-мастацкія асаблівасці “Жывых казак”<br>5. Карусь Каганец, Вацлаў Ластоўскі. Фальклорныя матывы ў творах<br>6. Максім Багдановіч . Паэтызацыя прыроды. Ідэйны змест казкі «Мушка-зелянушка і камарык – насаты тварык». | | | | | Творы Лейкі, Багдановіча | | |
| 3. | **Дзіцячая літаратура ў 20-я гады XX стагоддзя** | **1** | | | **1** | | | |
| | 1. Задачы літаратуры для юнага чытача: асваенне новых тэм, пашырэнне сувязі з жыццём, жанравае ўзбагачэнне.<br>2. Перыядычны друк для дзяцей. Дзейнасць часопісаў «Зоркі» (1921 – 1922), «Беларускі піянер» (1924 – 1929), газеты «Піянер Беларусі» (з 1929).<br>3. Дыскусія аб развіцці казачнага жанру ў літаратуры для падрастаючага пакалення.<br>4 Жыццесцвярджальны, мажорны, рамантычна-ўзнёслы пафас паэзіі, ідэйна-тэматычныя набыткі прозы для юнага чытача.<br>5. Перыядычны друк у Заходняй Беларусі. | 1 | | | 1 | Мастацкія творы Алеся Гаруна. Зб. “Матчын дар”, “Жывыя казкі для дзіцячага тэатру”.<br>Казкі “Каваль Вярнідуб”<br>А. Якімовіча, «Пра смелага ваяку Мішку…»<br>М. Лынькова. | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[4]<br>[5] | |
| 4. | **Дзіцячая літаратура ў 30-я гады XX стагоддзя** | **1** | | | 1 | | | |
| | 1. Далейшае развіццё дзіцячай літаратуры ў жанравых і тэматычных адносінах. Роля перыядычных выданняў у папулярызацыі мастацкага слова.<br>2. Пошукі пісьменнікаў у стварэнні вобраза юнага героя сучаснасці, узбагачэнне мастацкага вопыту дзіцячай літаратуры творамі Янкі Маўра, М. Лынькова.Паглыбленне псіхалагізму ў творах гэтага перыяду.<br>4. Паэзія для дзяцей, жанр казкі ў дзіцячай літаратуры 30-х гг.<br>5. Дзіцячая драматургія.Фальклорная аснова твораў. | 1 | | | 1 | | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[4]<br>[5] | |
| 5. | **Янка Купала** | **1** | | | **1** | | | |
| 5.1. | 1.Маленства паэта паводле кнігі З. Бандарынай «Ой, рана на Івана.» (1979), У. Сулкоўскага, А. Міраславіча «Янка Купала» (2007), У. Ліпскага «Янкаў вянок: дзецям пра Янку Купалу» (2009).<br>2. Сувязь з традыцыямі беларускага дзіцячага фальклору як адметныя рысы творчасці 20-х г. Янкі Купалы для юнага чытача.<br>3. Вершы Янкі Купалы 30-х гг. для юных чытачоў. Элементы ўмоўнасці ў творы.<br>4. Паэтычны роздум над лёсам дзяцей, іх будучыняй (вершы «Над калыскай», » Сірочая доля», «Песня сіраты» ).<br>5. Абуджэнне ў дзяцей пачуцця нацыянальнай годнасці, выхаванне любові да роднай зямлі, да роднай мовы – верш «Сын і маці». Паэтызацыя красы зімовай прыроды ў вершы «Мароз». Традыцыі фальклорнай паэтыкі ў творчасці Янкі Купалы.<br>6. Выкарыстанне фальклорных матываў і танцавальнай рытмікі ў вершы «Дзіцячае». Заахвочванне дзяцей да вучобы. Гісторыя напісання верша «Хлопчык і лётчык». | 1 | | | 1 | Камп’ютарная прэзентацыя № 2 | [1]<br>[5] | Рэфераты |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 7. Паказ шырокіх жыццёвых перспектыў для моладзі ў вершах «Сыны», «Алеся». «Хлопчык і лётчык на вайне» – раскрыццё думак і перажыванняў падлетка, абумоўленых трагедыяй вайны. Элементы ўмоўнасці ў творы. | | | | | | | |
| 6. | **Якуб Колас** | **1** | **2** | | 1 | | | |
| 6.1. | 1. Увага пісьменніка да праблем нацыянальнай літаратуры. Якуб Колас – аўтар «Другога чытання для дзяцей беларусаў».<br>2. Гуманістычны змест апавяданняў «Дзеравеншчына» (1912), «Сірата Юрка» (1914), «У старых дубах» (1912). Прырода і дзеці. Паказ імкнення дзяцей да свету, дзе пануе гармонія.<br>3. Вершаваная казка «Рак-вусач» (1926).<br>4.Пейзажныя вершы для дзяцей. Сатырычны верш «Савось-распуснік» (1926). Майстэрства паэта-псіхолага.<br>5. Паэма «Міхасёвы прыгоды» (1934). | 1 | | | 1 | Камп'ютарная прэзентацыя № 3<br>CD-дыск "Якуб Колас. Янка Купала". Аўдыёматэрыял, Мн., 2007. Свае творы чытаюць Якуб Колас, Янка Купала; творы Якуба Коласа чытае сын пісьменніка М. Міцкевіч | [1]<br>[5] | |
| 6.2. | 1. Якуб Колас – аўтар «Другога чытання для дзяцей беларусаў».<br>2. Гуманістычны змест апавяданняў «Дзеравеншчына» (1912), «Сірата Юрка» (1914), «У старых дубах» (1912). Тыпалагічнае падабенства апавяданняў «Ванька» А.Чэхава і «Дзеравеншчына» Якуба Коласа. Праблематыка апавяданняў «Страшнае спатканне», «Наталька», Джон і муха», «Рыбакі», «Чоран». Глыбіня пранікнення ў псіхалогію дзяцей.<br>3. Народная казка ў апрацоўцы Якуба Коласа («Дудар», «Як пеўнік ратаваў курачку», «Пчала і шэршань», «Зайкіна хатка» і інш.).<br>4. Вершаваная казка «Рак-вусач» (1926). Эстэтычнае, пазнавальнае і выхаваўчае значэнне казкі.<br>5. Пейзажныя вершы для дзяцей: «На полі вясной», «На рэчцы зімою», «Песня аб вясне», «Зіма», «На лузе», «Ручэй» і інш. Майстэрства паэта-псіхолага ў сатырычным вершы «Савось-распуснік» (1926).<br>6. Паэма «Міхасёвы прыгоды» (1934). Прырода і дзеці. Метафарычнасць мовы. | | 2 | | | CD-дыск "Якуб Колас. Янка Купала". Аўдыёматэрыял, Мінск, 2007.<br>Творы Якуба Коласа | [1]<br>[5] | Слуханне вершаў у выкананні М. Міцкевіча Калёквіум па паэзіі (чытанне вершаў на памяць) |
| 7. | **Змітрок Бядуля** | **1** | **1** | | 1 | | | |
| 7.1. | 1. Маленства Змітрака Бядулі .<br>2. Пачатак літаратурнай дзейнасці.<br>3. Паэзія З. Бядулі для маленькага чытача.<br>4. Зварот да сюжэтаў і матываў вуснай народнай творчасці. | 1 | | | 1 | Манаграфія В.А.Лашкевіч "Змітрок Бядуля – дзецям | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[4]<br>[5] | |
| 7.2. | 1. Тэматыка, мастацкія асаблівасці апавяданняў 1912 – 1915 гг. («Пяць лыжак заціркі», «Малыя дрывасекі», «Велікодныя яйкі», «Дзе канец свету?» ). Драматызм, вастрыня канфліктаў, глыбокі псіхалагізм, прастата і лаканічнасць апісання.<br>2.Паэзія З. Бядулі для маленькага чытача: «Мае забавы», «Дудачка», | | 1 | | | Манаграфія В.А. Лашкевіч "Змітрок Бядуля – дзецям"<br>Кнігі З. Бядулі для | [2]<br>[3] | Экспрэс-апытанне. |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | «Калыханка», «Вясной», «Сняжынкі», «Конік», «Верабейчык» і інш.<br>3. Аповесць «Сярэбраная табакерка» (1940). Кантрастнае размежаванне дабра і зла. Шматпланавасць твора, умоўнасць вобразаў. | | | | | дзяцей | | |
| 8. | **Янка Маўр** | **1** | **2** | | 1 | | | |
| 8.1. | 1. Старонкі жыцця Янкі Маўра паводле аўтабіяграфічнай аповесці «Шлях з цемры»<br>2. Пачатак літаратурнай дзейнасці. Навукова-пазнавальная аповесць «Чалавек ідзе» (1926).<br>3. Апавяданні 1920-х гадоў «Слёзы Тубі», «Незвычайная прынада», «Лацароні».<br>4. Распрацоўка жанраў прыгодніцкай аповесці («У краіне райскай птушкі», 1928, «Сын вады», 1928), рамана для юнага чытача («Амок», 1929).<br>5. Зварот да нацыянальнай тэматыкі. Праблема чалавека і прыроды, іх узаемаадносін у аповесці «Палескія рабінзоны» (1930). Праблема выхавання асобы ў паўсядзённым жыцці (школьная аповесць «ТВТ», 1934).<br>6. Спроба распрацаваць жанр фантастычнай аповесці («Фантамабіль прафесара Цылякоўскага, 1954). Навуковая дакладнасць і мастацкія пралікі.<br>7. Значэнне творчасці Янкі Маўра ў развіцці дзіцячай літаратуры. | 1 | | | 1 | Манаграфіі:<br>Яфімава М. “Цэлы свет — дзецям”.<br>Гурэвіч Э. “Янка Маўр: Нарыс жыцця і творчасці”. | [7] | |
| 8.2. | 1. Навукова-пазнавальная аповесць «Чалавек ідзе» (1926).<br>2. Апавяданні 20-х гадоў «Слёзы Тубі», «Незвычайная прынада», «Лацароні».<br>3. Распрацоўка жанраў прыгодніцкай аповесці («У краіне райскай птушкі», 1928, «Сын вады», 1928)<br>4. Праблема чалавека і прыроды, іх узаемаадносін у аповесці «Палескія рабінзоны» (1930). Творчая распрацоўка пісьменнікам традыцыйнага сюжэта рабінзанады.<br>5. Праблема выхавання асобы ў паўсядзённым жыцці (аповесць «ТВТ», 1934).<br>6. Псіхалагічныя апавяданні Янкі Маўра 30-х гадоў: «Шчасце», «Бярозавы конь», «Падарожжа вакол дома». | | 2 | | | Творы Янкі Маўра | [2]<br>[3] | Абарона праектаў |
| 9. | **Дзіцячая літаратура першага пасляваеннага дзесяцігоддзя** | **1** | | | **1** | | | |
| | 1. Грамадска-палітычная атмасфера пасля Перамогі.<br>2. Прыход новых аўтараў (Васіль Вітка, А. Вольскі, П. Кавалёў, А. Васілевіч, Я. Бяганская, В. Хомчанка, Н. Гілевіч, Е. Лось, А. Дзеружынскі і інш.)<br>3. Патрыятычная накіраванасць мастацкай літаратуры ў гады Вялікай Айчыннай вайны Арганічнае збліжэнне літаратуры для дарослага чытача і дзяцей.<br>4. Шляхі развіцця прозы ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе, яе шматтэмнасць і шматжанравасць. | 1 | | | 1 | Кнігі Янкі Брыля, Э. Агняцвет,<br>А. Вялюгіна,<br>А. Вольскага,<br>В. Віткі, М. Танка | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[4]<br>[5] | |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 10. | **Алесь Якімовіч** | **1** | **1** | | 1 | | | |
| 10.1. | 1. Дзяцінства будучага пісьменніка. Вучоба ў Белпедтэхнікуме, Белдзяржуніверсітэце. Праца настаўнікам.<br>2. Тэматычная і жанравая разнастайнасць прозы пісьменніка.<br>3. Зварот да вуснай народнай творчасці. | 1 | | | 1 | Творы А. Якімовіча | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[4]<br>[5] | |
| 10.2. | 1. Зварот пісьменніка да маральна-этычных праблем (зборнік апавяданняў «Залатыя рукі», 1975).<br>2. Тэма Вялікай Айчыннай вайны ў творчасці А. Якімовіча: аповесць «Смелыя людзі» (1960), апавяданні «Аўтамат» (1945), «Аладкі» (1944), «Чарнавочка» (1947).<br>3. Сучаснасць і далёкая гісторыя ў аповесцях «Базылёў курган» (1954), «Адкуль ліха на свеце» (1963), «Канец сервітуту» (1968), «Кастусь Каліноўскі» (1971), «Цяжкі год» (1976).<br>4.Зварот да вуснай народнай творчасці. Творчая апрацоўка казак. | | 1 | | | Мастацкія творы Алеся Якімовіча | [2]<br>[3] | Экспрэс-апытанне |
| 11. | **Уладзімір Дубоўка** | **1** | **1** | | 2 | | | |
| 11. 1. | 1. Першыя творы для дзяцей (казкі «Музыка-чарадзейнік», «Залатое дно» ). Супрацоўніцтва ў часопісе «Беларускі піянер» (1924).<br>2. Вяртанне ў літаратуру пасля працяглага перапынку. Творчае асваенне традыцый вуснай творчасці народаў свету.<br>3. Тэма чалавека і прыроды ў навукова-пазнавальных аповесцях У. Дубоўкі «Жоўтая акацыя» (1967), «Ганна Алелька» (1969) і прыгодніцкай аповесці «Як Алік у тайзе заблудзіўся» (1974). Асаблівасці падачы матэрыялу. | 1 | | | 2 | Манаграфія Д. Бугаёў Уладзімір Дубоўка: кніга пра паэта. | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[4]<br>[5] | |
| 11.2. | 1. Маральна-этычная праблематыка казак, філасафічнасць зместу. Асаблівасці паэтыкі.<br>2. Тэма чалавека і прыроды ў навукова-пазнавальных аповесцях У. Дубоўкі «Жоўтая акацыя» (1967), «Ганна Алелька» (1969) і прыгодніцкай аповесці «Як Алік у тайзе заблудзіўся» (1974). Асаблівасці падачы матэрыялу. | | 1 | | | | [2]<br>[3] | Выразнае чытанне і каменціраваны аналіз твораў У. Дубоўкі |
| 12. | **Дзіцячая літаратура 1955 – 1965 гадоў** | **1** | | | **2** | | | |
| | 1. Літаратурна-грамадская атмасфера сярэдзіны 50 – 60-х гг.<br>2. Здабыткі паэзіі Васіля Віткі, С. Грахоўскага, С. Шушкевіча, М. Калачынскага, А. Пысіна і інш.<br>3. Проза. Узмацненне цікавасці да маральна-этычнай праблематыкі. Кнігі апавяданняў. | 1 | | | 2 | Кнігі для дзяцей В. Вольскага, А. Пальчэўскага, Е. Л ось | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[4]<br>[5] | Рэфераты |
| 13. | **Дзіцячая літаратура 1965 – 1985 гадоў** | **1** | | | **2** | | | |
| | 1. Плённае развіццё прозы. Пашырэнне тэматычных абсягаў.Жанрава-стылявыя пошукі ў адлюстраванні тэмы Вялікай Айчыннай вайны. Творчасць літаратараў – «дзяцей вайны».<br>2. Навукова-пазнавальная літаратура. Краязнаўчыя кнігі В. Вольскага «Падарожжа па краіне беларусаў» (1968), «Палессе» (1971). Цыклы прыродазнаўчых нарысаў пісьменніка «Лёс Дункана» (1978), «Дзень | 1 | | | 2 | Кнігі для дзяцей Б. Сачанкі, В. Казько, У. Караткевіча, Д. Слаўковіча, П. Рунца, П. Кавалёва, | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[4]<br>[5] | |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | добры, Бяроза» (1984).<br>3. «Зямля над белымі крыламі» (1977) У. Караткевіча<br>4. Вядучыя матывы, вобразы літаратуры для дзяцей гэтага перыяду.<br>5. Паэзія. Жанрава-тэматычная разнастайнасць. Багацце творчых індывідуальнасцей. | | | | | В. Гарбука,<br>У. Юрэвіча | | |
| 14. | **Максім Танк** | **1** | **1** | | 2 | | | |
| 14.1. | 1. Першыя творы Максіма Танка для дзяцей у заходнебеларускіх часопісах «Беларускі летапіс» і «Снапок». Увага паэта да вуснай народнай творчасці. Агляд кнігі «Блікі сонца» (1997).<br>2. Тэматыка і праблематыка твораў Максіма Танка для дзяцей. | 1 | | | 2 | Камп’ютарная прэзентацыя № 4 | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[4]<br>[5] | |
| 14.2. | 1. Услаўленне смеласці і самаахвярнасці ў барацьбе за праўду і справядлівасць («Сказ пра Вяля» ). Ідэя непераможнасці мастацтва («Казка пра Музыку» ).<br>2. Вершаваная апрацоўка народных казак «Конь і Леў», «Галінка і верабей», «Ехаў казачнік Бай», «Журавель і чапля». Маральна-этычныя праблемы ў гэтых казках.<br>3. Праблемы таварыскасці, сціпласці ў творах з уласна аўтарскім сюжэтам («Жук і слімак», «Мухамор». «Казка пра мядзведзя», «Сярод лясоў наднёманскіх» ).<br>4. Напаўненне традыцыйнага казачнага сюжэта сучасным зместам – «Быліна пра касмічнае падарожжа Мураша Бадзіні». Спалучэнне рэальнага і неверагоднага ў творах паэта.<br>5. «Лемантар» Максіма Танка як вандроўка па моўных схованках. Метафарычнасць, казачная асацыятыўнасць, нацыянальны каларыт твораў паэта. | | 1 | | | Казкі У. Дубоўкі, М. Танка,<br>С. Шушкевіч | [2]<br>[3] | Калёквіум па паэзіі М. Танка (чытанне вершаў на памяць) |
| 15. | **Станіслаў Шушкевіч** | **1** | | | 2 | | | |
| | 1. Пачатак літаратурнай дзейнасці. Арыентацыя паэта на фальклорныя традыцыі. Вобразы беларускай фауны і флоры як скразныя ў кнігах для дзяцей<br>2. Тэма працы, паэтызацыя прыроды, вершы-жарты.<br>3. Асаблівасці паэтыкі вершаў С. Шушкевіча: канкрэтнасць паэтычнага вобраза, дакладнасць рыфмы, інтанацыйнае багацце, меладычнасць. | 1 | | | 2 | Кнігі для дзяцей: «Лясная калыханка», «Сарочы церамок» і інш. | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[4]<br>[5] | |
| 16. | **Васіль Вітка** | **1** | **2** | | 2 | | | |
| 16.1. | 1. Паэт пра сваё маленства, пра настаўнікаў у жыцці і літаратуры.<br>2. Творчае выкарыстанне народных матываў, сюжэтаў, вобразаў, моўна-выяўленчых сродкаў у казках.<br>3. Вершаваныя жанры дзіцячага фальклору (калыханкі, пацешкі, лічылкі, загадкі, скорагаворкі) у апрацоўцы Васіля Віткі (зборнікі<br>4. Майстэрства Васіля Віткі як апавядальніка<br>5. Васіль Вітка — лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, лаўрэат Ганаровага дыплома імя Г. Х. Андэрсена. | 1 | | | 2 | Камп’ютарная прэзентацыя № 5 | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[4]<br>[5] | |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 16.2. | 1. Казка для дзяцей «Вавёрчына гора». Пафас дзейснай дабраты, узаемадапамогі, калектывізму, народна-песенная вобразнасць, прыём антрапамарфізму.<br>2. Вершаваныя жанры дзіцячага фальклору (калыханкі, пацешкі, лічылкі, загадкі, скорагаворкі) у апрацоўцы Васіля Віткі. Вершы пра птушак (кніга «Госці», 1984).<br>3. Майстэрства Васіля Віткі як апавядальніка («Зайчык-вадалаз», «Чмяліны мёд», «Трывога ў Ельнічах» і інш.). Юны герой у розных дачыненнях да людзей і прыроды.<br>4. Выступленні паэта па праблемах выхавання дзяцей і развіцця дзіцячай літаратуры. Выхаванне любові да слова і адчування яго хараства. | | 2 | | | Манаграфія С. Марчанкі Васіль Вітка: Нарыс жыцця і творчасці.<br>Кнігі Васіля Віткі для дзяцей | [2]<br>[3] | Калёквіум па паэзіі Васіля Віткі (чытанне вершаў на памяць) |
| 17. | **Алена Васілевіч** | **1** | **1** | | 2 | | | |
| 17.1. | 1. Тэтралогіі «Пачакай, затрымайся» (1972).<br>2. Аналітычнасць і псіхалагізм прозы А. Васілевіч. Раскрыццё ўнутранага свету дзяцей. Сюжэтнасць і эмацыянальнасць апавяданняў. | 1 | | | 2 | Мастацкія творы А. Васілевіч | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[4]<br>[5] | |
| 17.2. | 1. Тэтралогія «Пачакай, затрымайся» (1972). Паказ духоўнага станаўлення, фарміравання светапогляду Ганькі Гурыновіч.<br>2. Маральна-этычная праблематыка апавяданняў «Шурка Рэмзікаў», «Сябры», «Вернісаж», «Арфа» і інш.<br>3. Тэма «чалавек і прырода» ў апавяданнях «Браты-артысты», «Геша», «Бабуліны кватаранты», «Калінавая рукавічка» і інш. | | 1 | | | Зборнікі апавяданняў «Заўтра ў школу», «Сябры», «Калінавая рукавічка» | [2]<br>[3] | Напісанне эсэ па творах А. Васілевіч |
| 18. | **Эдзі Агняцвет** | | **1** | | 2 | | | |
| 18.1. | 1.Тэматычная і жанравая шматстайнасць творчасці Эдзі Агняцвет.<br>2.Паэтызацыя працы, пейзажныя вершы, тэма аховы прыроды, тэма міру і дружбы.<br>3. Сатырычна-гумарыстычныя вершы.<br>4. Тэма Вялікай Айчыннай вайны ў творчасці Эдзі Агняцвет. | | 1 | | 2 | | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[4]<br>[5] | Экспрэс-апытанне |
| 19. | **Артур Вольскі** | **1** | **1** | | **2** | | | |
| 19.1. | 1.Наватарскія пошукі ў галіне тэм і жанраў.<br>2.Спалучэнне паэзіі, прозы і драматургіі ў некаторых творах паэта . | 1 | | | 2 | Кнігі А. Вольскага для дзяцей | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[4]<br>[5] | |
| 19.2. | 1. Аналіз кніг «Чарнічка» (1964), «Рагатка» (1971), «Што такое мікра тое» (1971) і інш.<br>2. Спалучэнне паэзіі, прозы і драматургіі ў некаторых творах паэта («Рагатка», «Лясныя мастакі», «Сцяпан – Вялікі Пан» ).<br>3. Вобраз Беларусі ў кнізе «Ізумрудавы горад, дзе ты?.» | | 1 | | | Зб. вершаў Эдзі Агняцвет, Артура Вольскага | [2]<br>[3] | Рэфераты |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 4. Гумарыстычныя вершы. Займальнасць сюжэтаў, казачнасць.<br>5. Тэма хлеба як чалавечай каштоўнасці («Хлеб – усяму галава», 1989).<br>6. Асаблівасці азбук «Жывыя літары» (1973), «Ад А да Я – прафесія мая» (1987). | | | | | | | |
| 20. | **Ніл Гілевіч** | **1** | **1** | | 2 | | | |
| 20.1. | 1. Фальклорныя матывы і жанры ў паэзіі Ніла Гілевіча.<br>2. Творы, напісаныя Н. Гілевічам па матывах балгарскай дзіцячай паэзіі . | 1 | | | 2 | Камп’ютарная прэзентацыя № 6 | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[4] | |
| 20.2. | 1. Фальклорныя матывы і жанры ў паэзіі Ніла Гілевіча. Займальнасць, мастацкая дасканаласць загадак (зборнікі «Сіні домік, сіні дом», 1961; «Загадкі», 1971).<br>2. Творы, напісаныя Н. Гілевічам па матывах балгарскай дзіцячай паэзіі («Казка пра самалёт», «Белы мядзведзь у заапарку», «Песня пра ручаёк», «Перапалох», «Бяроза і дуб», «Ленка», «За што мяне мама не пацалавала?» і інш. – кніга «Добры чалавек» ). | | 1 | | | | | Падрыхтоўка прэзентацый |
| 21. | **Рыгор Барадулін** | **1** | **1** | | 2 | | | |
| 21.1. | 1. Жанравая разнастайнасць паэзіі Р. Барадуліна (вершы, калыханкі, пацешкі, жарты, скорагаворкі, лічылкі, задачкі, загадкі, казкі).<br>2. Спосабы актывізацыі мастацкага мыслення дзяцей: вершы-пытанні, камічныя<br>3. Роля паэзіі Р. Барадуліна ў абуджэнні цікавасці да роднага слова, чуйнасці да яго гучання, выхаванні ў дзяцей назіральнасці і пачуцця прыгожага. | 1 | | | 2 | Камп’ютарная прэзентацыя № 7 | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[4]<br>[5] | |
| 21.2. | 1. Жанравая разнастайнасць паэзіі Р. Барадуліна (вершы, калыханкі, пацешкі, жарты, скорагаворкі, лічылкі, задачкі, загадкі, казкі).<br>2. Здольнасць паэта гуляць словам, уменне віртуозна карыстацца гукапісам, каламбурыць.<br>3. Свет маленства ў вершах. Вершы пра жывёл і птушак.<br>4. Традыцыі фальклору і наватарскія пошукі паэта ў жанры казкі («Бабуліна казка», «Мех шэрых, мех белых», «Не паслухаў зайчык маму», «Як воўк калядаваў», «Залатая прасніца» ). | | 1 | | | Кнігі паэзіі Ніла Гілевіча, Рыгора Барадуліна для дзяцей | [2]<br>[3] | Калёквіум па паэзіі (чытанне вершаў на памяць) |
| 22. | **Павел Місько** | **1** | **1** | | 2 | | | |
| 22.1. | 1.Пазнавальны і выхаваўчы патэнцыял апавяданняў П. Місько пра прыроду. Маральна-этычная праблематыка апавяданняў.<br>2. Тэматычная разнастайнасць аповесцей<br>3.Казачныя прыгоды ў кнізе «Прыйдзі, дзень-залацень!». | 1 | | | 2 | | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[4]<br>[5] | |
| 22.2. | 1. Гумарыстычная аповесць «Навасёлы, або Праўдзівая, часам вясёлая, часам страшнаватая кніга пра незвычайны месяц у жыцці Жэні Мурашкі» (1972). Элементы прыгодніцтва ў творы.<br>2. Праблемы сяброўства, чалавечых узаемаадносін у аповесцях | | 1 | | | | | Экспрэс-апытанне |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | «Прыгоды Бульбобаў», «Грот афаліны», «Эрпіды на планеце Зямля» і інш.<br>3.Казачныя прыгоды ў кнізе «Прыйдзі, дзень-залацень!». | | | | | | | |
| 23. | **Уладзімір Ліпскі** | **1** | **1** | | 2 | | | |
| 23.1. | 1. Звесткі з біяграфіі У. Ліпскага. Рэдактарская дзейнасць у часопісе «Вясёлка». Ул. Ліпскі – лаўрэат Літаратурных прэмій імя Янкі Маўра (1993), імя Васіля Віткі (1997), Дзяржаўнай прэміі (2000).<br>2. Дзіцячы свет у апавяданнях У. Ліпскага Псіхалагізм, жыццёвасць сітуацый, адметнасць вобразаў.<br>3. Арыгінальныя сюжэты, казачная плынь, прыгодніцкія элементы ў аповесцях . | 1 | | | 2 | | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[4]<br>[5] | |
| 23.2. | 1. Дзіцячы свет у апавяданнях У. Ліпскага. Псіхалагізм, жыццёвасць сітуацый, адметнасць вобразаў.<br>2. Арыгінальныя сюжэты, казачная плынь, прыгодніцкія элементы ў аповесцях «Рыгоркавы прыгоды», «Клякса-Вакса і Янка з Дзіўнагорска», 1982 і інш.<br>3. Пазнавальны і выхаваўчы патэнцыял кніг «Азбука жыцця» (2010), «Я тут жыву: дзецям пра Беларусь» (2008), «Свіцязянская русалка» (2009), «Вясёлка над Нёманам» (2011). | | 1 | | | | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[4]<br>[5] | Напісанне эсэ па творах<br>У. Ліпскага |
| 24. | **Георгій Марчук** | **1** | **1** | | **2** | | | |
| 24.1. | 1. Тэматычная і жанравая разнастайнасць творчасці Г. Марчука. Мастацкая каштоўнасць, педагагічная накіраванасць казак, п'ес, навел. Агляд кнігі "Чужое багацце" (2012).<br>2. Традыцыі фальклору і наватарскія пошукі пісьменніка ў жанры казкі. Агляд кніг казак "Дзікая груша" (2000), "Прыгоды Агапкі і ката Фокуса" (2012). Элементы прыгодніцтва і паэтыка, напаўненне казачных сюжэтаў новым зместам, набліжэнне да сучаснасці. | 1 | | | 2 | | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[4]<br>[5] | Рэфераты |
| 24.2. | 1. Мастацкая каштоўнасць, педагагічная накіраванасць казак, п'ес, навел.<br>2. Традыцыі фальклору і наватарскія пошукі пісьменніка ў жанры казкі : "Дзікая груша" (2000), "Прыгоды Агапкі і ката Фокуса" (2012). Элементы прыгодніцтва і паэтыка, напаўненне казачных сюжэтаў новым зместам, набліжэнне да сучаснасці. | | 1 | | | | | Экспрэс-апытанне |
| 25. | **Уладзімір Ягоўдзік** | **1** | **2** | | 2 | | | |
| 25.2. | 1. Зварот У. Ягоўдзіка да народных скарбаў (кнігі "Сонейка, свяці!", 1988; «Заклятыя скарбы», 1992; «Вужовы кароль», 1996).<br>2. Тэма далёкага мінулага Беларусі ў гісторыка-пазнавальнай кнізе «Сем цудаў Беларусі» (1999).<br>3. Фальклорная аснова твораў, прысвечаных роднай прыродзе. Выхаванне экалагічнай культуры і цікавасці дзяцей да пазнання прыроды.<br>4. Маральна-этычная праблематыка п'ес-казак. | | 2 | | 2 | | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[4]<br>[5] | Аналіз твораў |
| 26. | **Дзіцячая літаратура на сучасным этапе: проза, паэзія,** | **4** | **6** | | **4** | | | |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | **драматургія** | | | | | | | |
| 26.1. | 1. Пашырэнне жанрава-тэматычных абсягаў у прозе, паэзіі, драматургіі.<br>2. Сучасная літаратурная казка і яе асаблівасці.<br>3. Характэрныя асаблівасці сучаснай паэзі.<br>4. Драматургія для дзяцей.<br>5. Зварот да жанру “фэнтэзі”:<br>6. Экалагічныя праблемы ў п’есах.<br>7. Выкарыстанне літаратурных крыніц для стварэння новых узораў сцэнічных твораў для дзяцей<br>8. Мастакі-ілюстратары дзіцячых кніг.<br>9. Перыядычны друк для дзяцей. Часопіс “Вясёлка”. | 2<br>2 | | | 4 | | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[4]<br>[5] | |
| 26.2. | 1. Гістарычнае мінулае і сённяшні дзень роднай зямлі, непаўторная прырода Беларусі ў кнігах Я. Пархуты, У. Ліпскага «, В. Гардзея, У. Бутрамеева, У. Арлова, С. Тарасава і інш.<br>2. Сінтэз паэзіі і прозы ў кнізе В. Зуёнка «Бадзірог» (1995): «карагод вясёлых прыгод – і рыфмай звязаных, і проста расказаных». Агляд кнігі В. Зуёнка «Рэха» (2003).<br>3. Сучасная літаратурная казка і яе асаблівасці.<br>4. Жанравае багацце паэзіі – казкі, паэмы, вершы, калыханкі, пацешкі, загадкі, задачкі, скорагаворкі, песні. Шырыня тэматыкі: вершы аб Радзіме, прыродзе, працы, пра дзяцінства.<br>5. Зварот да жанру “фэнтэзі.<br>6. Выкарыстанне літаратурных крыніц для стварэння новых узораў сцэнічных твораў для дзяцей.<br>7. Аналіз перыядычнага друку для дзяцей. Часопіс “Вясёлка”: асноўныя рубрыкі, тэматыка.<br>8. Развіццё сучаснай юнацкай аповесці. Творы Я.Хвалей, В.Гапеева, А.Якімовіча | | 2<br>2<br>2 | | | Кнігі сучасных аўтараў | | Экспрэс-апытанне |
| | **УСЯГО** | **28** | **28** | | **44** | | | **Залік** |

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА
# ЛІТАРАТУРА

**Асноўная літаратура:**

1. Дзіцячая літаратура (беларуская) : вучэб. дапам. / Т. У. Ганчарова-Цынкевіч, С. А. Сычова. − Мінск : БГПУ, 2021. − 236 с.

2. Сычова, С. А. Дзіцячая літаратура [Электроны рэсурс] : ВМК для спецыяльнасцей 1-02 03 01 Беларуская мова і літаратура; 1-02 03 03-04 Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (з указаннем мовы) / С. А. Сычова. – Рэжым доступу: http://elib.bspu.by/handle/doc/2537. – Дата доступу: 20.11.2021.

**Дадатковая літаратура:**

1. Беларуская дзіцячая літаратура ў тэрмінах і паняццях : дапам. ; пад рэд. А. М. Макарэвіча. – Магілёў : Магіл. дзярж. ун-т, 2014. – 140 с.

2. Беларуская дзіцячая літаратура : вучэб. дапам. / А. М. Макарэвіч (і інш.) ; пад агул. рэд.А.М. Макарэвіча, М. Б. Яфімавай. − Мінск : Выш. шк., 2008. − 687 с.

3. Беларуская дзіцячая літаратура : хрэстаматыя ; склад. М. Б . Яфімава, В. М. Ляшук. − Мінск : Выш. шк., 2003. − 638 с.

4. Беларуская дзіцячая літаратура : хрэстаматыя : вучэб. дапам. для студэнтаў пед. спец. ВНУ ; аут.-склад. М. Ф. Шаўлоўская. – Мінск : Юнипресс, 2006. – 688 с.

5. Дыдактычны матэрыял па беларускай дзіцячай літаратуры : вучэбна-метадычны дапаможнік / М. Ф. Шаўлоўская. – 3-е выд. – Мінск : БДПУ, 2007. – 82 с.

6. Трафімчык, А. В. Беларуская дзіцячая драматургія / А. В. Трафімчык. – Мінск : Ковчег, 2012. – 127 с.

## МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ І ВЫКАНАННІ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ

Мэтай самастойнай работы з’яўляецца мэтанакіраванае навучанне асноўным навыкам і ўменням для выканання самастойнай работы.

Задачамі самастойнай работы студэнтаў з’яўляюцца:

– актывізацыя вучэбна-пазнавальнай дзейнасці студэнтаў;

– фарміраванне ўменняў і навыкаў самастойнага авалодання ведамі;

– фарміраванне ўменняў і навыкаў самастойнага прымянення ведаў на практыцы;

– самаразвіццё і самаўдасканаленне.

Пры выкананні самастойнай работы павінны быць створаны ўмовы, пры якіх будзе забяспечвацца актыўная роля студэнтаў у самастойным атрыманні ведаў і сістэматычным прымяненні і х на практыцы.

Кантроль самастойнай работы можа ажыццяўляцца ў выглядзе кантрольнай работы, тэста, абмеркавання рэфератаў, абмеркавання і абароны вучэбных заданняў, экспрэс-апытванняў на аўдыторных занятках.

## ПЕРАЛІК ЗАДАННЯЎ І КАНТРОЛЬНЫХ МЕРАПРЫЕМСТВАЎ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

| № п/п | Назва тэмы | Колькасць гадзін на СРС | Заданні | Форма выканання |
|---|---|---|---|---|
| 1. | **Уводзіны. Вытокі беларускай дзіцячай літаратуры** | 1 | Вывучыць адпаведны матэрыял і падрыхтаваць вусны адказ на тэму:<br>Перыядызацыя беларускай дзіцячай літаратуры. | Вусная праверка атрыманых ведаў, кантрольныя пытанні |
| 2. | **Дзіцячая літаратура пачатку ХХ стагоддзя** | 1 | Вывучыць адпаведны матэрыял і падрыхтаваць вусны адказ на тэму:<br>Цётка «Першае чытанне для дзетак беларусаў» (1906). Тэма жыцця беларускай вёскі як асноўная тэма твораў чытанкі («Нядзеля», «Наша гаспадарка», «Мая вёска» ). Гуманістычны змест апавядання «Міхаська». | Вусная праверка атрыманых ведаў, кантрольныя пытанні |
| 3. | **Дзіцячая літаратура ў 20-я гады ХХ стагоддзя** | 1 | Вывучыць адпаведны матэрыял і падрыхтаваць вусны адказ на тэму:<br>Перыядычны друк для дзяцей. Дзейнасць часопісаў «Зоркі» (1921 – 1922), «Беларускі піянер» (1924 – 1929), газеты «Піянер Беларусі» (з 1929). | Вусная праверка атрыманых ведаў, кантрольныя пытанні |
| 4. | **Дзіцячая літаратура ў 30-я гады ХХ стагоддзя** | 1 | Вывучыць адпаведны матэрыял і падрыхтаваць вусны адказ на тэму:<br>Паэзія для дзяцей, жанр казкі ў дзіцячай літаратуры 1930-х гг. | Вусная праверка атрыманых ведаў, кантрольныя пытанні |
| 5. | **Янка Купала** | 1 | Вывучыць адпаведны матэрыял і падрыхтаваць вусны адказ на тэму:<br>Абуджэнне ў дзяцей пачуцця нацыянальнай годнасці, выхаванне любові да роднай зямлі, да роднай мовы – верш «Сын і маці». Паэтызацыя красы зімовай прыроды ў вершы «Мароз». Традыцыі фальклорнай паэтыкі ў творчасці Янкі Купалы. | Вусная праверка атрыманых ведаў, кантрольныя пытанні |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 6. | **Якуб Колас** | 1 | Вывучыць адпаведны матэрыял і падрыхтаваць вусны адказ на тэму:<br>Народная казка ў апрацоўцы Якуба Коласа («Дудар», «Як пеўнік ратаваў курачку», «Пчала і шэршань», «Зайкіна хатка» і інш.). | Вусная праверка атрыманых ведаў, кантрольныя пытанні |
| 7. | **Змітрок Бядуля** | 1 | Вывучыць адпаведны матэрыял і падрыхтаваць вусны адказ на тэму:<br>Паэзія З. Бядулі для маленькага чытача: «Мае забавы», «Дудачка», «Калыханка», «Вясной», «Сняжынкі», «Конік», «Верабейчык» і інш. | Вусная праверка атрыманых ведаў, кантрольныя пытанні |
| 8. | **Янка Маўр** | 1 | Вывучыць адпаведны матэрыял і падрыхтаваць вусны адказ на тэму:<br>Праблема выхавання асобы ў паўсядзённым жыцці (школьная аповесць «ТВТ», 1934). Асоба і калектыў. Ацэнка аповесці «ТВТ» Янкам Купалам, М. Горкім, С. Маршаком. | Вусная праверка атрыманых ведаў, кантрольныя пытанні |
| 9. | **Дзіцячая літаратура першага пасляваеннага дзесяцігоддзя** | 1 | Вывучыць адпаведны матэрыял і падрыхтаваць вусны адказ на тэму:<br>Патрыятычная накіраванасць мастацкай літаратуры ў гады Вялікай Айчыннай вайны Арганічнае збліжэнне літаратуры для дарослага чытача і дзяцей. | Вусная праверка атрыманых ведаў, кантрольныя пытанні |
| 10. | **Алесь Якімовіч** | 1 | Вывучыць адпаведны матэрыял і падрыхтаваць вусны адказ на тэму:<br>Тэма Вялікай Айчыннай вайны ў творчасці А. Якімовіча: аповесць «Смелыя людзі» (1960), апавяданні «Аўтамат» (1945), «Аладкі» (1944), «Чарнавочка» (1947). | Вусная праверка атрыманых ведаў, кантрольныя пытанні |
| 11. | **Уладзімір Дубоўка** | 2 | Вывучыць адпаведны матэрыял і падрыхтаваць вусны адказ на тэму:<br>Тэма чалавека і прыроды ў навукова-пазнавальных аповесцях У. Дубоўкі «Жоўтая акацыя» (1967), «Ганна Алелька» (1969) і прыгодніцкай аповесці «Як Алік у тайзе заблудзіўся» (1974). | Вусная праверка атрыманых ведаў, кантрольныя пытанні |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 12. | **Дзіцячая літаратура 1955 - 1965 гадоў** | 2 | Вывучыць адпаведны матэрыял і падрыхтаваць вусны адказ на тэму:<br>Здабыткі паэзіі Васіля Віткі, С. Грахоўскага, С. Шушкевіча, М. Калачынскага, А. Пысіна і інш. | Вусная праверка атрыманых ведаў, кантрольныя пытанні |
| 13. | **Дзіцячая літаратура 1965 - 1985 гадоў** | 2 | Вывучыць адпаведны матэрыял і падрыхтаваць вусны адказ на тэму:<br>Навукова-пазнавальная літаратура. Краязнаўчыя кнігі В. Вольскага «Падарожжа па краіне беларусаў» (1968), «Палессе» (1971). Цыклы прыродазнаўчых нарысаў пісьменніка «Лёс Дункана» (1978), «Дзень добры, Бяроза» (1984). | Вусная праверка атрыманых ведаў, кантрольныя пытанні |
| 14. | **Максім Танк** | 2 | Вывучыць адпаведны матэрыял і падрыхтаваць вусны адказ на тэму:<br>«Лемантар» Максіма Танка як вандроўка па моўных сховах. Метафарычнасць, казачная асацыятыўнасць, нацыянальны каларыт твораў паэта. | Вусная праверка атрыманых ведаў, кантрольныя пытанні |
| 15. | **Станіслаў Шушкевіч** | 2 | Вывучыць адпаведны матэрыял і падрыхтаваць вусны адказ на тэму:<br>Асаблівасці паэтыкі вершаў С. Шушкевіча: канкрэтнасць паэтычнага вобраза, дакладнасць рыфмы, інтанацыйнае багацце, меладычнасць. | Вусная праверка атрыманых ведаў, кантрольныя пытанні |
| 16. | **Васіль Вітка** | 2 | Вывучыць адпаведны матэрыял і падрыхтаваць вусны адказ на тэму:<br>Майстэрства Васіля Віткі як апавядальніка («Зайчык-вадалаз», «Чмяліны мёд», «Трывога ў Ельнічах» і інш.). Юны герой у розных дачыненнях да людзей і прыроды. | Вусная праверка атрыманых ведаў, кантрольныя пытанні |
| 17. | **Алена Васілевіч** | 2 | Вывучыць адпаведны матэрыял і падрыхтаваць вусны адказ на тэму:<br>Аналітычнасць і псіхалагізм прозы А. Васілевіч. Раскрыццё ўнутранага свету дзяцей. Сюжэтнасць і эмацыянальнасць апавяданняў. | Вусная праверка атрыманых ведаў, кантрольныя пытанні |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 18. | **Эдзі Агняцвет** | 2 | Вывучыць адпаведны матэрыял і падрыхтаваць вусны адказ на тэму:<br>Тэма Вялікай Айчыннай вайны ў творчасці Эдзі Агняцвет. | Вусная праверка атрыманых ведаў, кантрольныя пытанні |
| 19. | **Артур Вольскі** | 2 | Вывучыць адпаведны матэрыял і падрыхтаваць вусны адказ на тэму:<br>Асаблівасці азбук «Жывыя літары» (1973), «Ад А да Я – прафесія мая» (1987) В. Вольскага. | Вусная праверка атрыманых ведаў, кантрольныя пытанні |
| 20. | **Ніл Гілевіч** | 2 | Вывучыць адпаведны матэрыял і падрыхтаваць вусны адказ на тэму:<br>Творы, напісаныя Н. Гілевічам па матывах балгарскай дзіцячай паэзіі («Казка пра самалёт», «Белы мядзведзь у заапарку», «Песня пра ручаёк», «Перапалох», «Бяроза і дуб», «Ленка», «За што мяне мама не пацалавала?» і інш. – кніга «Добры чалавек» ). | Вусная праверка атрыманых ведаў, кантрольныя пытанні |
| 21. | **Рыгор Барадулін** | 2 | Вывучыць адпаведны матэрыял і падрыхтаваць вусны адказ на тэму:<br>Жанравая разнастайнасць паэзіі Р. Барадуліна (вершы, калыханкі, пацешкі, жарты, скорагаворкі, лічылкі, задачкі, загадкі, казкі). | Вусная праверка атрыманых ведаў, кантрольныя пытанні |
| 22. | **Павел Місько** | 2 | Вывучыць адпаведны матэрыял і падрыхтаваць вусны адказ на тэму:<br>Казачныя прыгоды ў кнізе «Прыйдзі, дзень-залацень!» П. Місько. | Вусная праверка атрыманых ведаў, кантрольныя пытанні |
| 23. | **Уладзімір Ліпскі** | 2 | Вывучыць адпаведны матэрыял і падрыхтаваць вусны адказ на тэму:<br>Пазнавальны і выхаваўчы патэнцыял кніг «Азбука жыцця» (2010), «Я тут жыву: дзецям пра Беларусь» (2008), «Свіцязянская русалка» (2009), «Вясёлка над Нёманам» (2011). | Вусная праверка атрыманых ведаў, кантрольныя пытанні |
| 24. | **Георгій Марчук** | 2 | Вывучыць адпаведны матэрыял і падрыхтаваць вусны адказ на тэму: | Вусная праверка атрыманых ведаў, |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | | Мастацкая каштоўнасць, педагагічная накіраванасць казак, п’ес, навел. Агляд кнігі «Чужое багацце» (2012). | кантрольныя пытанні |
| 25. | **Уладзімір Ягоўдзік** | 2 | Вывучыць адпаведны матэрыял і падрыхтаваць вусны адказ на тэму:<br>Тэма далёкага мінулага Беларусі ў гісторыка-пазнавальнай кнізе «Сем цудаў Беларусі» (1999). | Вусная праверка атрыманых ведаў, кантрольныя пытанні |
| 26. | **Дзіцячая літаратура на сучасным этапе: проза, паэзія, драматургія** | 4 | Вывучыць адпаведны матэрыял і падрыхтаваць вусны адказ на тэму:<br>Перыядычны друк для дзяцей. Часопіс «Вясёлка» | Вусная праверка атрыманых ведаў, кантрольныя пытанні |
| | **УСЯГО** | **44** | | |

## ПЕРАЛІК РЭКАМЕНДАВАНЫХ СРОДКАЎ ДЫЯГНОСТЫКІ КАМПЕТЭНЦЫЙ СТУДЭНТАЎ

Дыягностыка кампетэнцый можа праводзіцца ў розных формах.

*У вуснай форме:*

– гутарка;
– калёквіум;
– даклад на практычных занятках;
– прэзентацыя дзіцячых кніг, часопісаў;
– даклад на канферэнцыі;
– вусны залік.

*У пісьмовай форме:*

– тэст;
– рэферат;
– падрыхтоўка эсэ;
– напісанне рэцэнзіі;
– публікацыя артыкула;
– пісьмовы залік.

## КРЫТЭРЫІ АЦЭНКІ ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

*10 (дзесяць) балаў, залічана:*

сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне, а таксама па асноўных пытаннях, якія выходзяць за яе межы;

дакладнае выкарыстанне навуковай тэрміналогіі (у тым ліку на замежнай мове), пісьменны, лагічна правільны выклад адказу на пытанні;

бездакорнае валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго эфектыўна выкарыстоўваць пры пастаноўцы і вырашэнні навуковых і прафесійных задач;

выяўленая здольнасць самастойна і творча вырашаць складаныя праблемы ў нестандартнай сітуацыі;

поўнае і глыбокае засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне;

уменне вольна арыентавацца ў тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне і даваць ім аналітычную ацэнку, выкарыстоўваць навуковыя дасягненні іншых дысцыплін;

творчая самастойная праца на практычных, лабараторных занятках, актыўны творчы ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў.

*9 (дзевяць) балаў, залічана:*

сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

дакладнае выкарыстанне навуковай тэрміналогіі (у тым ліку на замежнай мове), пісьменны, лагічна правільны выклад адказу на пытанні;

валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго эфектыўна выкарыстоўваць пры пастаноўцы і вырашэнні навуковых і прафесійных задач;

здольнасць самастойна і творча вырашаць складаныя праблемы ў нестандартнай сітуацыі ў межах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

поўнае засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне;

уменне арыентавацца ў тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне і даваць ім аналітычную ацэнку;

сістэматычная, актыўная самастойная праца на практычных, лабараторных занятках, творчы ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў.

*8 (восем) балаў, залічана:*

сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне ў аб'ёме вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

выкарыстанне навуковай тэрміналогіі (у тым ліку на замежнай мове), пісьменны, лагічна правільны выклад адказу на пытанні, уменне рабіць абгрунтаваныя высновы і абагульненні;

валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны (метадамі комплекснага аналізу, тэхнікай інфармацыйных тэхналогій), уменне яго выкарыстоўваць пры пастаноўцы і вырашэнні навуковых і прафесійных задач;

здольнасць самастойна вырашаць складаныя праблемы ў межах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

уменне арыентавацца ў тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне і даваць ім аналітычную ацэнку;

актыўная самастойная праца на практычных, лабараторных занятках, сістэматычны ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў.

*7 (сем) балаў, залічана:*

сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

выкарыстанне навуковай тэрміналогіі (у тым ліку на замежнай мове), пісьменны, лагічна правільны выклад адказу на пытанні, уменне рабіць абгрунтаваныя высновы і абагульненні;

валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго выкарыстоўваць пры пастаноўцы і вырашэнні навуковых і прафесійных задач;

вольнае валоданне тыпавымі рашэннямі ў рамках вучэбнай праграмы установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне, засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

уменне арыентавацца ў асноўных тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне і даваць ім аналітычную ацэнку;

самастойная праца на практычных, лабараторных занятках, удзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў.

*6 (шэсць) балаў, залічана:*

дастаткова поўныя і сістэматызаваныя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

выкарыстанне неабходнай навуковай тэрміналогіі, пісьменны, лагічна правільны выклад адказу на пытанні, уменне рабіць абагульненні і абгрунтаваныя высновы;

валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго выкарыстоўваць пры вырашэнні вучэбных і прафесійных задач;

здольнасць самастойна выкарыстоўваць тыпавыя рашэнні ў межах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

уменне арыентавацца ў базавых тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вывучаемай дысцыпліне і даваць ім параўнальную ацэнку;

актыўная самастойная праца на практычных, лабараторных занятках, перыядычны ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў.

*5 (пяць) балаў, залічана:*

дастатковыя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, пісьменны, лагічна правільны выклад адказу на пытанні, уменне рабіць высновы;

валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго выкарыстоўваць пры вырашэнні вучэбных і прафесійных задач;

здольнасць самастойна выкарыстоўваць тыпавыя рашэнні ў межах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

уменне арыентавацца ў базавых тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне і даваць ім параўнальную ацэнку;

самастойная праца на практычных, лабараторных занятках, фрагментарны ўдзел у групавых абмеркаваннях, дастатковы ўзровень культуры выканання заданняў.

*4 (чатыры) балы, залічана:*

дастатковы аб'ём ведаў у межах адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі;

засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, лагічны выклад адказу на пытанні, уменне рабіць высновы без істотных памылак;

валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго выкарыстоўваць пры вырашэнні стандартных (тыпавых) задач;

уменне пад кіраўніцтвам выкладчыка вырашаць стандартныя (тыпавыя) задачы;

уменне арыентавацца ў асноўных тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне і даваць ім ацэнку;

праца пад кіраўніцтвам выкладчыка на практычных, лабараторных занятках, дапушчальны ўзровень культуры выканання заданняў.

*3 (тры) балы, не залічана:*

недастаткова поўны аб'ём ведаў у рамках адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі;

веданне часткі асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, выклад адказу на пытанні з істотнымі, лагічнымі памылкамі;

слабое валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, некампетэнтнасць пры вырашэнні стандартных (тыпавых) задач;

няўменне арыентавацца ў асноўных тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне;

пасіўнасць на практычных і лабараторных занятках, нізкі ўзровень культуры выканання заданняў.

*2 (два) балы, не залічана:*

фрагментарныя веды ў рамках адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі;

веды асобных літаратурных крыніц, рэкамендаваных вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

няўменне выкарыстоўваць навуковую тэрміналогію вучэбнай дысцыпліны, наяўнасць у адказе грубых, лагічных памылак;

пасіўнасць на практычных і лабараторных занятках, нізкі ўзровень культуры выканання заданняў.

*1 (адзін) бал, не залічана:*

адсутнасць ведаў (і кампетэнцый) у рамках адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі, адмова ад адказу, адсутнасць на атэстацыі без уважлівай прычыны.

**ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ**
па вывучаемай дысцыпліне
з іншымі дысцыплінамі спецыяльнасці

| Назва вучэбнай дысцыпліны, вывучэнне якой звязана з дысцыплінай рабочай праграмы | Кафедра, якая забяспечвае вывучэнне гэтай дысцыпліны | Прапановы кафедры аб зменах у змесце рабочай праграмы | Рашэнне, прынятае кафедрай, якая распрацавала вучэбную праграму (з указаннем даты і нумара пратакола) |
|---|---|---|---|
| «Вусная народная творчасць» | кафедра беларускай і замежнай літаратуры | Звярнуць увагу на фальклорныя жанры для дзяцей і іх адметнасць | 26.11.2021 пратакол № 5 |
| «Уводзіны ў літаратуразнаўства» | кафедра беларускай і замежнай літаратуры | Звярнуць увагу на новыя жанры і жанравыя формы «Дзіцячай літаратуры» | 26.11.2021 пратакол № 5 |